КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №41 (125)
◂ 28 ЛІСТАПАДА ◂ 2008 г.

# Новы Час



**НЕ БОЙЦЕСЯ БЫЦЬ БЕЛАРУСАМІ**

Стар. 3

**КРЫЗІС НЕЛЬГА ЎПУСЦІЦЬ, ІМ ТРЭБА КАРЫСТАЦЦА**

Фінансавы крызіс падараваў беларускім кампаніям шанец перагледзець падыходы ў вядзенні бізнесу. Да такіх высноў прыйшлі ўдзельнікі міжнароднай бізнес-канферэнцыі «Топ- менеджмент: сіла інавацый», якая адбылася ў Мінску.

Стар. 5

**КОМПЛЕКС ПАДЗЕННЯ**

Цяперашняя Германія падзеленая паміж прыхільнікамі і апанентамі аднаго фільму...

Стар. 12

**ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ СТОЛЯМІ**

Асаблівасці беларускай культуры альтэрнатыўных клубаў.

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«ПРАЦЯГВАЮ СЛУЖЫЦЬ БЕЛАРУСІ»**

7 снежня Радзіму Гарэцкаму спаўняецца 80 гадоў. Размову з вядомым беларускім вучоным і грамадскім дзеячам вядзе наш карэспандэнт Вольга Хвоін.

▸ МЕРКАВАННЕ

# ДЫЯЛОГ: ХАЛЯВЫ НЕ БУДЗЕ

Алег НОВІКАЎ

**У рамках праграмы для журналістаў беларускіх незалежных СМІ ў Брусэлі адбылося некалькі сустрэч з чыноўнікамі ЕС, якія вядуць таемныя перамовы з Мінскам. Я таксама быў адным з удзельнікаў гэтай праграмы, і хацелася б падзяліцца з чытачамі «НЧ» сваімі ўражаннямі.**





«Гэта не для друку. Маё імя не павінна фігураваць у вашых матэрыялах», — так звычайна пачынаюцца размовы з прадстаўнікамі апарату ЕС, якія адказваюць за перамоўны працэс з Мінскам. Яны таксама ўпарта адмаўляюцца назваць імёны людзей з прэзідэнцкай адміністрацыі, з якімі кантактуюць і вядуць экзатычны гандаль, прадметы якога — свабода друку ў Беларусі, празрыстыя выбары, нашы з вамі грамадзянскія свабоды і г.д.

У выніку цяжка зразумець, дзе ў словах апаратчыкаў праўда, дзе палітычная рэклама, дзе асабістая раскрутка або імітацыя бурнай дзейнасці, звычайная дэмагогія, а дзе намер зліць у прэсу інфармацыю, публікацыя якой будзе мець эфект уплыву на апанентаў. Непразрыстасць перамоваў дае падставу для любых версій.

Такім чынам, мы маем фактычна зачынены дыялог ЕС—РБ, які паступова набывае сталы фармат. Мяркуючы па ўсім, некалькі асобаў з абодвух бакоў рэгулярна сустракаюцца і абмяркоўваюць стан рэчаў, выслухоўваюць узаемныя патрабаванні. Вынікі кантактаў перадаюцца наверх, дзе фармуюць павестку для наступнай сустрэчы, у тым ліку межы магчымых саступак. Прадстаўнікі зноў сустракаюцца, выслухоўваюць адзін аднаго, спрабуюць знайсці кампраміс.

Нашто гэта Мінску? Дыпламаты ЕС адмаўляюцца наўпрост казаць пра матывы ўрадавых колаў РБ змяніць парадыгму дзяржаўнай мадэлі. «Самі падумайце», — кажуць яны. Праўда, некалькі разоў непрамым тэкстам яны намякнулі, што да перамоваў уладу падштурхоўвае адсутнасць легітымнасці і комплекс маргінальнасці ў прадстаўнікоў цяперашняй беларускай палітычнай эліты, наступствы фінансавага крызісу, імперыялістычныя амбіцыі Крамлю і немагчымасць мадэрнізаваць гаспадарку без заходніх інвестыцый.

Нашто гэта Захаду? З фрагментаў перамоў вынікае, што Мінск у прынцыпе гатовы пашырыць люфт дэмакратыі. Кажуць, што існуе нават складзены ў Адміністрацыі спіс магчымых саступак, які быў перапраўлены кіраўніцтву ЕС. Змест спісу, аднак, не вядомы. Быццам там ёсць пункты пра магчымы перагляд прынятага закону пра СМІ, пашырэнне права на стварэнне і рэгістрацыю няўрадавых арганізацый і дэмакратызацыю выбарчага працэсу. Адзін раз суразмоўца заікнуўся нават пра датэрміновыя парламенцкія выбары па новаму заканадаўству, якія пройдуць раней за прэзідэнцкія. Праўда, упэўненасці ў яго словах не прагучала.

Чаго ўжо дабіўся Захад? Калі мова ідзе пра дыялог, чыноўнікі ЕС выглядаюць шчаслівымі як дзеці. Нарэшце, як яны кажуць, іх рэплікі на адрас Карла Маркса, 38 маюць хаця б нейкую сталую рэакцыю і хоць які канструктыўны адказ. Прычым некаторыя патрабаванні Захаду часткова выконваюць. Акрамя вызвалення палітычных вязняў, напрыклад, дыпламаты ЕС прыпісваюць сабе і апошнюю лібералізацыю на рынку прэсы (вяртанне газет «Наша Ніва» і «Народная Воля» ў кіёскі і падпісныя каталогі). Праўда, пры гэтым прызнаюць, што зменаў дабіцца было не проста.

Што на гэты момант атрымаў Мінск? Мінск, здаецца, пакуль нічога не атрымаў, аднак патэнцыйна можа атрымаць вельмі шмат. Паваротнай датай тут, мяркуючы па ўсім, будзе 3 снежня. У гэты дзень ЕС агучыць пачатак новай праграмы «Усходняе еўрапейскае партнёрства». Праект будзе прапанаваны блоку краін былога СССР: Украіне, Малдове, Беларусі, Грузіі, Арменіі і Азербайджану. Генеральная задача праекту — стварыць на перыферыі ЕС стабільныя палітычныя прадказальныя рэжымы, якія хаця б фармальна, як Азербайджан, прытрымліваюцца дэмакратычных стандартаў і не паводзяць сябе так правакацыйна, як Беларусь.

Праграма будзе ўключаць такія пункты, як паслабленне візавага рэжыму з ЕС, стварэнне з ЕС зоны вольнага гандлю, рэгіянальнае супрацоўніцтва, дапамогу ў рэформе заканадаўства, якое зробіць краіну прывабнай для інвестараў з ЕС. Аб'ём прамой фінансавай падтрымкі для Беларусі ў выпадку далучэння да праграмы можа вырасці ў дзесяткі разоў.

Па словах чыноўнікаў ЕС, Мінск папярэдне ўжо пагадзіўся на ўдзел у праекце. Прычым Масква, якая быццам ведае пра планы ЕС, не супраць. Калі ўсё пойдзе добра, то падпісанне пагаднення адбудзецца ў сакавіку наступнага года ў Чэхіі, якая на той час будзе выконваць функцыі старшыні ЕС.

На пытанне пра тое, ці магчымы візіт у Прагу Аляксандра Лукашэнкі, не прагучала адназначнага адказу, аднак у ЕС лічаць, што такі асабісты кантакт у выпадку працягу дыялогу ў пэўны час будзе патрэбны. На жаль, вельмі шмат рэчаў у Беларусі залежаць ад волі канкрэтнай асобы.

***P.S.:*** Прысутныя на падобных сустрэчах беларускія журналісты, якія ведаюць кошт абяцанням роднай улады, са скептычнай усмешкай успрымалі мажорную рыторыку еўрапейскіх чыноўнікаў. Адзін з удзельнікаў праграмы ўзгадаў, як у свой час «Народная Воля» была пазбаўленая права друкавацца ў Беларусі літаральна за 15 хвілін (столькі спатрэбілася прэзідэнцкаму чыноўніку, каб патэлефанаваць усім беларускім тыпаграфіям і даць адпаведныя інструкцыі). «Якія гарантыі, што падобнае не паўторыцца, калі ваш дыялог нечакана затармозіцца?» — спытаў журналіст. У адказ еўрапейцы пачалі пераконваць, што за апошнія гады больш-менш вывучылі логіку паводзін беларускага рэжыму. «Мы адмянілі санкцыі для Мінску роўна на шэсць месяцаў. Засталося чатыры. Калі не будзе прагрэсу, усё будзе як раней», — запэўніў дыпламат. І дадаў беларускі народны фразеалагізм: «Халявы не будзе».

Хочацца спадзявацца на лепшае. Аднак непрыемнае адчуванне таго, што твой лёс вырашаюць за цябе іншыя, усё роўна з'явіўся.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ



### БАБРУЙСК

**З 28 лістапада па 4 снежня ў Бабруйску пройдзе Міжнародны фестываль нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, прымеркаваны да 200-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры.**

Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка 25 лістапада на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Арганізатарамі фестывалю выступаюць Міністэрства культуры, Магілёўскі аблвыканкам і Бабруйскі гарвыканкам. Фестывальная праграма ўключае выступленні 12 калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы і Латвіі, якія пройдуць на сцэне Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча і Палаца мастацтваў.

Фестываль адкрыецца спектаклем «Каласы пад сярпом тваім» паводле рамана Уладзіміра Караткевіча ў пастаноўцы Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

29 лістапада ў межах фестывалю ў Тэатральным скверы Бабруйска будзе адкрыты помнік В. Дуніну-Марцінкевічу. Апрача таго, падчас фестывальнага тыдня пройдуць паказы інсцэніровак беларускай класікі, створаных аматарскімі тэатрамі Магілёўскай вобласці, адбудзецца прэзентацыя праекта «Пуцявінамі перакананага асветніка, адметнага драматурга, таленавітага акцёра».

### БЯРОЗАЎСКІ РАЁН

**Ва ўрочышчы Смалярка Бярозаўскага раёна 23 лістапада адкрыты памятны знак ахвярам Халакоста.**

Як паведаміў старшыня Брэсцкага гарадскога габрэйскага грамадскага аб'яднання «Брыск» Барыс Брук, манумент усталяваны на месцы гібелі габрэяў — вязняў Бярозаўскага гета, дзе ў 1942 годзе фашысты расстралялі больш за 3 тысячы чалавек. На чорным гранітным камні, што пастаўлены на пастаменце, надпіс на трох мовах — беларускай, англійскай і іўрыце аб тым, што помнік устаноўлены ў памяць аб ахвярах нацызму.

Як зазначыў Б. Брук, у цырымоніі адкрыцця памятнага знака ўзялі ўдзел прадстаўнікі мясцовай улады, рэспубліканскіх габрэйскіх арганізацый, брэсцкай і пінскай габрэйскіх абшчын, гісторыкі, мясцовае насельніцтва, а таксама стваральнікі і кіраўнікі фонду Лазарусаў (Вялікабрытанія) Майкл і Даяна Лазарусы, афіцыйны прадстаўнік дабрачыннай арганізацыі «Джойнт» у Беларусі Ёні Леферт, генеральны консул генеральнага консульства Польшчы ў Брэсце Яраслаў Ксёнжэк.

«Гэты манумент — яшчэ адно ўвекавечанне памяці ахвяраў Халакоста на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, дзе фашысты знішчылі больш як 250 тысяч габрэяў, — падкрэсліў Брук. — Пра гэтую трагедыю ў рэгіёне нагадваюць звыш за 40 помнікаў і памятных знакаў. Памятны знак ва ўрочышчы Смалярка выраблены на сродкі фонду Лазарусаў, добраўпарадкаванне тэрыторыі — жыхароў Бярозы Аліка і Галіны Арсланавых».

### ГОМЕЛЬ



**У Гомелі 23 лістапада прайшоў «круглы стол» з удзелам спецыялістаў у галіне атамнай энергетыкі «Антыядзерны лікбез».**

Мэта мерапрыемства — ліквідацыя некампетэнтнасці ў сферы атамнай энергіі і ўплыву АЭС на прыроду і чалавека, абгрунтаванне пазіцыі праціўнікаў будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі. З дакладамі на гэту тэму выступілі ініцыятары стварэння руху «Вучоныя за бяз'ядзерную Беларусь» доктар тэхнічных навук Георгій Лепін і кандыдат тэхнічных навук Юрый Варонежцаў.

Разважаючы аб планах кіраўніцтва Беларусі па будаўніцтве АЭС, Варонежцаў падкрэсліў, што «рашэнне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі — гэта рашэнне, якое мяжуе са злачынствам». Свае словы вучоны абгрунтаваў данымі навуковых даследаванняў аб уплыве радыяцыі на экалогію і здароўе чалавека, у прыватнасці, беларусаў, якія жывуць на забруджаных тэрыторыях. Ю. Варонежцаў нагадаў, наколькі скажонай была інфармацыя аб уплыве радыяцыі на арганізм чалавека, якая даходзіла да людзей пасля аварыі на ЧАЭС.

Георгій Лепін выказаў меркаванне, што ў Беларусі няма спрыяльных фактараў для будаўніцтва АЭС, такіх, напрыклад, як наяўнасць спецыялістаў, сродкі для будаўніцтва і эксплуатацыі, згода народа, магчымасць арганізацыі захоўвання радыеактыўных адходаў. Пацвярджэнне тэзісам выступлення Г. Лепіна ўтрымлівалася ў яго кнігах «Мірны атам» — злы жарт атамшчыкаў» (у сааўтарстве з Іванам Смолярам) і «Чарнобыльская мазаіка».

▸ СПРАВА

# БАРАЗЕНКУ БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ

**Працэс над Аляксандрам Баразенкам, які прызначаны на панядзелак, 8 снежня, адбудзецца ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска. Пра гэта паведаміў БелаПАН яго адвакат Павел Сапелка.**

Судзіць Аляксандра будзе Наталля Вайцяховіч. Раней меркавалася, што працэс будзе весці суддзя Валерый Есьман, аднак яго імя згадана Аляксандрам Лукашэнкам на нарадзе па барацьбе з карупцыяй 13 лістапада.

Баразенка з'яўляецца фігурантам «справы чатырнаццаці». За ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў зімой 2008 года іншыя фігуранты гэтай справы — Аляксей Бондар, Арцём Дубскі, Міхаіл Пашкевіч, Павел Вінаградаў, Міхаіл Крываў, Аляксандр Стральцоў, Аляксандр Чарнышоў, Таццяна Цішкевіч і Міхаіл Субач — прыгавораны да абмежавання волі на два гады без накіравання ў папраўчыя ўстановы. Антон Койпіш і Уладзімір Сяргееў аштрафаваны на 100 базавых велічыняў.

Непаўналетні Максім Дашук прыгавораны да 1,5 года абмежавання волі, Андрэй Кім — да пазбаўлення волі на 1,5 года з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму на падставе двух артыкулаў: гвалт у дачыненні да супрацоўніка міліцыі і ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. 20 жніўня Кім быў вызвалены ў адпаведнасці з указам прэзідэнта аб памілаванні.

Баразенка знаходзіцца ў следчым ізалятары № 1 па вуліцы Валадарскага ў Мінску. Актывіст аб'явіў галадоўку ў знак пратэсту, аднак адвакат здолеў пераканаць яго спыніць гэтую акцыю.

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# У ЧАЦВЁРТЫ РАЗ — НА РЭГІСТРАЦЫЮ

**Актывісты руху «За Свабоду» ў чацвёрты раз падалі дакументы ў Міністэрства юстыцыі Беларусі на рэгістрацыю грамадскага аб'яднання. Пра гэта БелаПАН паведаміў намеснік старшыні руху Юрый Губарэвіч.**




У заяве гаворыцца, што асноўнай мэтай праваабаронча-асветнага грамадскага аб'яднання «Рух «За Свабоду» з'яўляецца абарона правоў і свабод чалавека, зафіксаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародных дакументах па правах чалавека, а таксама інфармаванне грамадзян у гэтай сферы.

Рашэнне аб стварэнні грамадскай арганізацыі было прынята 23 кастрычніка 2008 года ў Магілёве на ўстаноўчай канферэнцыі грамадскага аб'яднання «Рух «За Свабоду». У канферэнцыі ўзялі ўдзел больш за 70 чалавек з розных рэгіёнаў краіны. Яны зацвердзілі статут і сфармавалі кіруючыя органы аб'яднання. Старшынёй абраны Аляксандр Мілінкевіч. Віктар Карняенка і Юрый Губарэвіч сталі яго намеснікамі.

Гэта ўжо чацвёртая спроба зарэгістраваць аб'яднанне. Двойчы ў 2007 годзе і адзін раз у 2008 годзе Мінюст адмаўляў у рэгістрацыі. Афіцыйнымі прычынамі былі прэтэнзіі да фармулёвак статута, а таксама той факт, што адна з устаноўчых канферэнцый аб'яднання праводзілася з парушэннямі закона «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь». Аргкамітэт спрабаваў апратэставаць рашэнні Міністэрства юстыцыі ў Вярхоўным судзе, але безвынікова.

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### ПРА РАТУШУ СКЛАДАЮЦЬ КНІГІ

**МАГІЛЁЎ.** У адноўленай Ратушы 23 лістапада адбылася прэзентацыя кнігі «Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне» з удзелам аўтараў і рэцэнзентаў Алеся Агеева і Алега Трусава, Ігара Марзалюка і Ігара Пушкіна. Мерапрыемства арганізавалі Цэнтральная гарадская бібліятэка імя Карла Маркса, Музей гісторыі Магілёва і Магілёўская гарадская арганізацыя ТБМ. Гасцямі імпрэзы сталі каля ста магілёўцаў.

### ГЕРОЙ УРУБЛЕЎСКІ Ў ДРУЗЕ

**ГРОДНА.** На адным з дамоў па вуліцы Урублеўскага яшчэ ў савецкія часы была ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар героя вызвольнага паўстання 1863 года. Падчас рэстаўрацыі дома дошка была знятая і апынулася ля сцяны будынка побач з кучай друзу. Жыхары дома сталі выказваць занепакоенасць такім стаўленнем да гістарычнай памяці. Тады будаўнікі схавалі дошку ў гаспадарчае памяшканне. Аднак пасля заканчэння рамонту будынка дошку не вярнулі на былое месца. Майстар мясцовага ЖЭСа Алена Брусевіч і будаўнікі сцвярджаюць, што дошку ўсталяваць на доме практычна не магчыма, бо яна вельмі цяжкая. Між тым, жыхары дома, абураныя паводзінамі дробных чыноўнікаў, звярнуліся да мясцовых уладаў.

### ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ВЁСКІ

**ДВАРЭЦ. ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁН.** Лекцыя, прысвечаная гістарычнай і культурнай спадчыне вёскі, адбылася ў мясцовай сярэдняй школе. У сустрэчы прымалі ўдзел старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч, загадчык аддзелу Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі Зміцер Яцкевіч і каардынатар кампаніі «Будзьма!» Ігар Лялькоў.

Асноўная частка дакладаў была прысвечаная тром мясцовым архітэктурным помнікам: неабарочнаму касцёлу, царкве XIX стагоддзя, а таксама руінам вадзянога млына, гісторыі іх пабудова і функцыянавання. Падчас сустрэчы адбыўся невялікі канцэрт з удзелам мясцовага гісторыка-патрыятычнага клубу «Спадчына», у які ўваходзяць дзеці 10–12 гадоў.

Напрыканцы сустрэчы было ўрачыстае ўшанаванне памяці паўстанцаў 1830–1831 гадоў у вёсцы Парэчча, на радзіме Міхала Валовіча. Тут у 2003 годзе мясцовымі актывістамі быў узведзены помнік легендарнаму беларускаму змагару.

### ПАДМУРАК ПОМНІКУ ДУНІНУ-МАРЦІНКЕВІЧУ

**СВІР. МЯДЗЕЛЬСКІ РАЁН.** Закладзены падмурак помніку Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу на Мядзельшчыне. Ініцыятарам ушанавання знакамітага беларускага творца выступіў мясцовы краязнаўца Іван Драўніцкі. Яго падтрымалі мясцовыя прыхільнікі даўніны і беларускасці, а таксама мастак Алесь Цыркуноў. У апошні час да гэтай ідэі прыхільна паставіліся мясцовыя ўлады.

### ІДЭОЛАГІ ДАЛІ ДАЗВОЛ

**ЛІДА.** Навучэнцы каледжа, у большасці сваёй будучыя педагогі, у межах дзейнасці гарадской арганізацыі ТБМ наладзілі выпуск бюлетэня «Прадмова», дзе распавядаюць пра свае праблемы, захапленні, інтарэсы. Частку першага нумара распаўсюдзілі сярод удзельнікаў нарады ідэалагічных працаўнікоў раёна. Тыя нечакана ўхвалілі бюлетэнь, пасля чаго яго выдаўцы сталі адкрыта распаўсюджваць сваю прадукцыю ў горадзе і раёне.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ВІЗІТ

# НЕ БОЙЦЕСЯ БЫЦЬ БЕЛАРУСАМІ

Вольга ХВОІН

**Візіт у Беларусь айца Аляксандра Надсана — значная падзея для беларускага свету, які прытрымліваецца нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. Айцец Аляксандр Надсан з'яўляецца апостальскім візітатарам для беларусаў ва ўсім свеце. Падставай яго для прыезду на радзіму сталася святкаванне юбілею — 50-годдзя святарскага пасвячэння.**



Photo.ByMedia.Net

**Даведка:**

Аляксандар Надсан нарадзіўся 8 жніўня 1926 года ў мястэчку Гарадзея недалёка ад Нясвіжу. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, дзе вучыўся на матэматыка. У 1944 годзе ён пакінуў Беларусь, пэўны час партызаніў у Францыі, потым уступіў у войска Андэрса пад Брытанскім камандаваннем. Пасля вайны Надсан застаўся ў Англіі, дзе паспяхова скончыў матэматычны факультэт Лонданскага універсітэту. 23 лістапада 1958 года з навуковай ступенню магістра багаслоўя Аляксандр Надсан прыняў святарскае пасвячэнне. З 1966 года Аляксандр Надсан кіраваў школай-інтэрнатам імя Кірылы Тураўскага пры Беларускай каталіцкай місіі для хлопчыкаў з беларускіх сем'яў розных веравызнанняў з краінаў Заходняй Еўропы. У 1971 годзе ў Лондане адкрылася беларуская бібліятэка імя Скарыны, і а. Аляксандар стаў яе нязменным кіраўніком. Пры бібліятэцы працуе музей, прысвечаны гісторыі Беларусі. У 1981 годзе а. Аляксандар стаў Рэктарам Беларускай каталіцкай місіі ў Вялікабрытаніі, а неўзабаве і Апостальскім візітатарам для беларусаў-каталікоў замежжа.

Кароткі візіт у Беларусь айца Аляксандра Надсана быў насычаны сустрэчамі: наведванне Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі, сустрэчы з журналістамі, вернікамі, сябрамі. У касцёле св. Сымона і Алены адбыўся ўрачысты вечар, на якім прадстаўнікі грамадскасці мелі магчымасць павіншаваць Аляксандра Надсана з 50-годдзем яго святарскай дзейнасці.

«Пашлі беларускаму народу ахвярных слугаў сваіх, якія праведным, сумленным і мудрым жыццём і дзейнасцю вялі б яго да лепшай долі. Дай нам святое духавенства. Благаславі нашыя сем'і, каб у кожнай з іх дбалы бацька і ахвярная маці, злучаныя шчырай і святой любоўю, выхоўвалі табе на славу, а бацькаўшчыне на карысць сваіх дзетак. Асаблівую ласку дай моладзі, каб яна атрымала глыбокае хрысціянскае ўзгадаванне і вырасла на карысных сыноў і дачок свайго народу. Благаславі нашыя дачасныя дастаткі, не дай згінуць марна тым талентам, якія ты пасылаеш у наш народ, але дай ім свабодна развівацца табе на славу і ўсяму людству на карысць», — гэта ўрывак з малітвы за беларускі народ, якую напісаў айцец Аляксандр. З яе і пачаліся віншаванні.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» Алег Трусаў падкрэсліў: «Такія людзі, як айцец Аляксандр, нараджаюцца ці не раз на сто гадоў. Яго святарская і навуковая дзейнасць, стварэнне ў Лондане выдатнай бібліятэкі, царквы, музею заслугоўваюць найвышэйшай хвалы».

«Не многім у жыцці Бог дае магчымасць, калі падзея асабістая становіцца падзеяй народу, — адзначыў паэт Генадзь Бураўкін. — Я вельмі рады, што Бог нам і Вам даў магчымасць адзначыць свой святарскі юбілей на роднай зямлі. Вы гэта заслужылі, бо Бог нічога проста так не дае. Вы выдатны ўзор шчаслівага яднання: як служыць Богу праз служэнне Беларусі, і як служыць Беларусі праз служэнне Богу. Гэта сапраўды святая справа, і ў Вас гэта атрымалася».

Сам айцец Аляксандр Надсан сказаў, што для яго вельмі важна сустрэць угодкі свайго пасвячэння ў Беларусі: «Хрыстос прыйшоў на зямлю, каб служыць людзям. Гэтак жа і святары служаць людзям, а не ім служаць людзі. І кожны чалавек для святара дарагі. Але як кожны чалавек, святар мае Бацькаўшчыну, якая яму найбольш дарагая, як і людзі, якія на ёй жывуць. На Захадзе яшчэ многія не зразумелі, што існуе такі народ, як беларусы. Мы ўспрымаемся як частка Расіі. Гавораць: «Чаго яны хочуць? Няхай свабоды, ідэнтычнасці, незалежнасці...» Нават калі размова ідзе пра свабоды чалавека, да гэтага асцярожна адносяцца. Для іх галоўнае — эканамічны прагрэс, матэрыяльнае багацце».

Нешта падобнае адбываецца і з эмігрантамі-беларусамі, якія прыязджаюць у Вялікабрытанію. «Тыя, хто са старой хвалі, гэта людзі, якія хацелі быць беларусамі, але ім не было месца ў Беларусі. Такіх засталося мала, — расказвае Аляксандр Надсан. — У новай хвалі эміграцыі пераважаюць людзі, якія з'ехалі з эканамічных прычынаў. Для іх нацыянальныя пытанні на другім плане. Ёсць і тыя, хто, напрыклад, закахаўся, ажаніўся. Яны збольшага застаюцца беларусамі, але такіх цяпер мала».

Сённяшняй Беларусі айцец Аляксандр Надсан амаль не бачыў — усе яго дні былі запоўненыя сустрэчам. Але сякімі-такімі ўражаннямі падзяліўся: «Мяне возяць з аднаго месца ў другое. Вялікі горад, многа машын, снегу. Уражвае расейшчына, якая паўсюль. Замнога. Але я цешуся, што большасць з маладых людзей, якія прыходзяць на сустрэчы са мною, беларускамоўныя. Думаю, іх не вельмі многа пакуль. Але пачатак добры».

На развітанне беларускі святар у замежжы, які праз усё жыццё пранёс павагу і любоў да сваіх вытокаў, пажадаў сваім суайчыннікам, «каб яны не баяліся паказваць, што ёсць менавіта беларусамі, а не кім іншым».

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ФІГАВАЯ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Апошнія падзеі па збліжэнні Беларусі з Захадам і па лібералізацыі палітычнай мадэлі выглядаюць на тое, што ўлада спрабуе прыкрыць свае заганы і «прычынныя месцы» фігавым лісцікам. Дарэчы, і слова «прычынныя» тут дарэчы. Улады спрабуюць паказаць адлігу, ліквідуючы толькі наступствы сваёй ранейшай палітыкі, а не прычыну.**

З высокага дазволу Адміністрацыі прэзідэнта газета «Народная воля» на тыдні здолела заключыць дамовы з «Белсаюздрукам» і «Белпоштай» на распаўсюджванне выдання праз розьнічную сетку кіёскаў і па падпісцы. Такама заключана дамова на друкаванне газеты ў сталічным Беларускім Доме друку. Раней выданне друкавалася ў Смаленску. «На наступным тыдні газета ў кіёсках «Белсаюздруку» будзе жалезна», — аптымістычна заявіў галоўны рэдактар гэтай газеты Іосіф Сярэдзіч.

Газета «Наша ніва» падпісала дагавор на распаўсюджванне толькі з «Белпоштай», паведаміў шэф-рэдактар выдання Андрэй Дынько. Гэта значыць, што падпісны індэкс выдання ўнясуць у канец падпіснога каталога ад рукі на кожным паштовым аддзяленні.

За калег можна парадавацца. Аднак ці значыць гэта тое, што ў дачыненні да СМІ надышла нейкая адліга і лібералізацыя? Ці значыць гэта тое, што ўлады выканалі адно з патрабаванняў Еўрасаюза? Безумоўна не. Гэта фігавы лісток, якім улады спрабуюць прыкрыць сваё нежаданне выконваць патрабаванні ЕС у поўным аб'ёме.

У патрабаваннях Еўропы ясна сказана: «забеспячэнне роўных умоў працы сродкаў масавай інфармацыі». Роўныя ўмовы — гэта не допуск у сістэму распаўсюду двух асобна ўзятых газет. Гэта допуск да распаўсюду на роўных правах усіх газет, гэта роўны доступ да крыніц інфармацыі, роўныя ўмовы акрэдытацыі і рэгістрацыі для ўсіх, без падзелу журналістаў на «чэсных» і «нячэсных». А пакуль: дзве газеты ў распаўсюдзе і падпісцы, а астатнія — больш за два дзесяткі, — як сядзелі ў рэзервацыі, так і будуць сядзець. У тым ліку «НЧ». Літаральна пару тыдняў таму рэдакцыя газеты атрымала чарговую, чацвёртую запар, адмову на распаўсюд праз «Белпошту» і «Белсаюздрук». Хіба гэта роўныя ўмовы?

Невядома, чаму кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю Яцэк Пратасевіч назваў гэта «вельмі важным сігналам з Мінска, які сведчыць пра сур'ёзнасць намераў палепшыць адносіны з ЕС». Бо калі няма роўных умоў працы, то як дазволілі — так і забараніць могуць.

Выказаў на тыдні гатоўнасць да такой «нанатэхналагічнай лібералізацыі» нават Аляксандр Лукашэнка. «Калі Еўрасаюзу і амерыканцам так гэтага хочацца і яны гатовыя нешта прапанаваць нам узамен, мы прыбяром з Крымінальнага кодэкса артыкул пра паклёп», — заявіў Аляксандр Лукашэнка 24 лістапада ў інтэрв'ю агенцтву «Франс Прэс».

Ізноў жа, звыклы прыём, неаднаразова «адкатаны» на перамовах па газу з Расіяй: «Вы нам пра Фаму, мы вам пра Ярому». Еўрасаюз патрабуе «выключэння з Крымінальнага кодэкса тых артыкулаў, што тычацца крымінальнага пераследу за грамадскую і палітычную дзейнасць». Найперш, гэта артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае да трох гадоў зняволення за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а не «артыкул пра паклёп». Тым больш, што для ўнясення зменаў у кодэкс трэба як мінімум разгляд гэтага пытання ў парламенце. А гэта бюракратычная машына. Пакуль прапанову ўнясуць у парламент, пакуль абмяркуюць у камісіях, пакуль пройдзе першае і другое чытанне, пакуль гэта зацвердзіць Савет Рэспублікі, пакуль падпіша прэзідэнт... Або ішак здохне, або візір.

Яшчэ адзін нібыта крок у напрамку да вольнага грамадства — «круглы стол», які прайшоў 24 лістапада пад назвай «Інтэрнэт-СМІ: выклікі ХХІ стагоддзя». На ім памочнік прэзідэнта Беларусі па ідэалогіі Усевалад Янчэўскі заявіў аб «разумным рэгуляванні інтэрнэта» і падкрэсліў, што «цэнзуры не будзе, інтэрнэт у Беларусі быў, ёсць і застанецца свабодным». «Пераследавацца павінен крымінальны змест, а не альтэрнатыўная думка», — лічыць памочнік прэзідэнта.

Што патрабавала Еўропа? Еўропа патрабавала адмены прынятага ў гэтым годзе новага закона аб СМІ, які прадугледжвае рэгуляванне інтэрнэта, а не заявы Янчэўскага пра тое, што інтэрнэт будзе «разумна рэгуляваны». Для пераследу крымінальнага зместу ў інтэрнэце існуе ўпраўленне «К» у адпаведных структурах, якое і зараз няблага раскрывае злачынствы ў сферы высокіх тэхналогій.

Прычым такія фігавыя лісцікі былі характэрныя на мінулым тыдні не толькі для сацыяльна-палітычнага жыцця краіны, а ў тым ліку і для эканамічнага, што значна горш. Перавага мадэлі развіцця Беларусі дазваляе ў вялікай ступені нейтралізаваць негатыўны ўплыў сусветнага фінансавага крызісу на эканоміку. Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў 25 лістапада на нарадзе з актывам Віцебскай вобласці. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў: «Мы не можам адгарадзіцца «жалезнай заслонай» ад гэтых з'яў і павінны ўлічваць іх у сваёй працы». Прэзідэнт зазначыў, што няпростая фінансавая сітуацыя, якая склалася ў свеце, у меншай ступені закранула Беларусь.

Ці зноў прэзідэнт стварае «кроплі туману» перад вачыма грамадзян, ці сапраўды ў гэта верыць — сказаць цяжка. Можа, яму нешта і не кажуць. Бо як можна сцвярджаць, што крызіс «у меншай ступені закрануў Беларусь»? Па ўсіх сайтах (вось вам і моц інтэрнэта!) прайшла інфармацыя пра тое, што на прамысловых прадпрыемствах Беларусі створаны антыкрызісныя камітэты. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» Анатоль Аканцінаў. Прычым, па ягоных словах, камітэты створаны па распараджэнні Міністэрства прамысловасці!

І яшчэ штрых «лібералізацыі». Сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Віктар Падчыненкаў і Уладзімір Ларын папрасілі палітычнага прытулку ў Бельгіі і Галандыі. Як паведаміў лідэр АГП Анатоль Лябедзька, Падчыненкаў быў кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на мінулых выбарах у парламент, а Ларын — кіраўніком яго выбарчага штаба. Цяпер Падчыненкаў знаходзіцца ў Антверпене, а Ларын — у Амстэрдаме.

Гэта яшчэ адзін адказ на пытанне, ці ёсць у Беларусі лібералізацыя. Калі актыўныя людзі прымаюць вымушанае рашэнне пакінуць краіну і прасіць прытулку — гэта шмат пра што гаворыць.

СПРАВА

# ARCHE АБВІНАВАЦІЛІ Ў ЭКСТРЭМІЗМЕ

Генадзь КЕСНЕР

**Упраўленне КДБ па Брэсцкай вобласці прызнала экстрэмісцкім летні (№ 7–8) нумар незалежнага часопіса «ARCHE» — адзінага беларускага выдання, запрошанага ў сетку еўрапейскіх інтэлектуальных часопісаў «Eurozine», аўтарамі якога з'яўляюцца вядомыя ў Беларусі і ў свеце філосафы, гісторыкі, літаратары.**

Амаль дэтэктыўная гісторыі з часопісам «ARCHE» пачалася яшчэ 24 кастрычніка, калі адзін з аўтараў выдання вёз дзесяць асобнікаў польскім падпісчыкам. Брэсцкія мытнікі на чале з Рэнатай Нядбаевай канфіскавалі часопіс. Нядбаева тады выказала прыватнае меркаванне, што гэты нумар «ARCHE» шкодзіць нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь. Рэдакцыя часопіса накіравала запыт як у Брэсцкую мытню, так і ў Дзяржаўны мытны камітэт, і вось за подпісам намесніка старшыні камітэту Сяргея Барысюка прыйшоў адказ. Сутнасць яго зводзілася да таго, што затрыманне часопіса было правамернае, матэрыялы нумара былі накіраваныя на экспертызу ў Брэсцкае ўпраўленне КДБ, якое пасля хадайнічала перад судом Маскоўскага раёна абласнога цэнтра аб прызнанні нумара экстрэмісцкім і аб яго знішчэнні.

«ARCHE» сёлета святкаваў дзесяць гадоў, і выйшаў нумар на тысячу сто старонак, для штомесячнага выдання гэта вельмі шмат. Ён выйшаў у колеры, гэта, магчыма, і збіла іх з панталыку, яны, відаць, думалі, што гэта нейкая замежная падрыўная літаратура, хоць нумар абсалютна легальна быў надрукаваны ў мінскай друкарні», — пракаментаваў галоўны рэдактар часопіса Валеры Булгакаў.




Што да зместу нумара, то ён быў прысвечаны пераважна гісторыі Беларусі да ўз'яднання з Расійскай імперыяй у 1795 годзе, і толькі каля сарака старонак — бягучым палітычным падзеям, напрыклад, перадвыбарчай сітуацыі ў краіне (каментар палітолага Віталя Сіліцкага), «кругламу сталу» па выбуху ў Мінску 4 ліпеня і інш.

«У якасці правакацыйнай з пункту гледжання КДБ можна трактаваць публікацыю кінакрытыка Андрэя Расінскага — рэцэнзію на фільм Анджэя Вайды «Катынь», дзе чэкісты і фашысты ставяцца ў адзін шэраг, паказваецца іх злавесная антыгуманная сутнасць, і ў гэтым сэнсе сведчанне ці прароцтва Андрэя Расінскага бліскуча пацвердзілася», — мяркуе рэдактар выдання.

Валера Булгакава непрыемна ўразіла фармулёўка высокага чыноўніка адносна лёсу канфіскаваных асобнікаў «ARCHE»: «Барысюк, намеснік старшыні Мытнага дзяржкамітэту, так і напісаў: «*журнал будет отправлен на уничтожение*». Сам гэты выраз нагадвае сапраўды нейкія змрочныя таталітарныя часы».

Па словах намесніка старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэя Бастунца, пытанне аб знішчэнні асобнікаў часопіса мусіць вырашаць толькі суд. «Пакуль што суды дублявалі захады КДБ у тым выпадку, калі справа даходзіла да разгляду, — адзначае юрыст. — Але ў апошнія часы ў Гродзенскай вобласці некалькі разоў суды на працэсуальных падставах адмаўляліся разглядаць гэтыя пастановы КДБ. Таму вельмі цікава, як гэтая справа будзе развівацца надалей».

Як лічыць Андрэй Бастунец, такія дзеянні спецслужбаў магчымыя толькі «дзякуючы» пэўным адметнасцям некаторых беларускіх заканадаўчых актаў: «Гэта, на мой погляд, дэманструе вельмі гутаперчавы характар вызначэння экстрэмізму, што знаходзіцца ў законе «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму», які дазваляе адносіць да экстрэмісцкай дзейнасці ўсё — нават маніторынгава-аналітычныя даклады праваабаронцаў, канцэртныя выступы і фільмы, якія займаюць першыя месцы на міжнародных фестывалях. Гэта праявы хваравітай актыўнасці Камітэта дзяржаўнай бяспекі».

Старшыня Саюзу беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч некалькі разоў быў сведкам падобных калізіяў, «калі на мытні адбываюцца перагрусы, калі мытнік альбо службовец памежных войскаў наструньваецца, чырванее і пачынае перабіраць, перагортваць наогул кніжкі, напісаныя па-беларуску, беларускамоўныя выданні».

«На сёння, на жаль, для некаторых беларуская кніга наогул з'яўляецца своеасаблівай бомбай, па-іншаму не скажаш, — адзначае Алесь Пашкевіч. — Калі чалавек вязе кантрабанду — тытунь, гарэлку ды іншае, мытня і памежныя войскі не так «пранікнёна» ставяцца да гэтага. Калі чалавек вязе асобнікі беларускамоўных кніг, для тых, хто стаіць на варце, гэта значыць, што чалавек «нацыянальна свядомы», і здараліся нават анекдатычныя выпадкі: аўтара кніжкі просяць расказаць, пра што гэтая кніга. Часопіс «ARCHE», і гэта не сакрэт, — адзін з першых часопісаў, якія займаюць не толькі культурніцкую, літаратурную, але і грамадска-палітычную нішу, ён друкуе аналітычныя, публіцыстычныя артыкулы. Гэта не першы момант, калі непасрэдна да часопіса «ARCHE» ва ўладаў былі пэўныя запытанні, і ён трапляў пад пераслед. А паколькі часопіс выдаецца і друкуецца легальна, не парушае заканадаўства, і на той момант нумар выдання не быў пад пераследам, на маю думку, ніводны дзяржаўны чыноўнік не мае права паставіць яго ці ягоную добранадзейнасць—нядобранадзейнасць пад сумнеў».

Тым часам галоўны рэдактар «ARCHE» Валеры Булгакаў не выключае, што яму давядзецца звярнуцца да інтэлектуалаў і культурных выданняў іншых еўрапейскіх краінаў з заклікам распачаць кампанію салідарнасці з ягоным выданнем.

ПРАЕКТ

# «ВАРШАЎСКІ МОСТ» — ВАНДРОЎКІ Ў ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ

**«Варшаўскі мост» — налева Польшча, направа Беларусь. Памежны пераход як дзверы паміж дзвама краінамі-суседкамі. Каб адчуць каларыт памежных вандровак, да Берасця ці Гродна можна і не ехаць: дастаткова ў чацвер а 17-й гадзіне ўключыць «Аўтарадыё». Словы вітання вы пачуеце акурат з «Варшаўскага моста» — сумеснай беларуска-польскай інфармацыйна-забаўляльнай праграмы. Пра міжнацыянальную перадачу і беларускіх радыёслухачоў наш карэспандэнт Вольга Хвоін размаўляе з Валерам Саўко — журналістам Беларускай рэдакцыі Польскага радыё і аўтарам праекту «Варшаўскі мост».**

***— Валер, якім ветрам цябе з Беларускай рэдакцыі Польскага радыё занесла на сталічную радыёстанцыю, ды яшчэ са сваім праектам?***

— Супрацоўніцтва з «Аўтарадыё» пачалося ў 2003 годзе. Перадача праводзілася спачатку раз на год, а пасля двойчы. Ад лета гэтага года мы выходзім у эфір штотыдзень. Ідэя «Варшаўскага моста» вельмі простая. У адносінах паміж Польшчай і Беларуссю вельмі многа палітыкі, а пра жыццё звычайных людзей у суседніх краінах мы ведаем мала. І я падумаў, што было б дора зрабіць перадачу, якая б расказвала пра культурныя, эканамічныя стасункі, супольную гістарычную спадчыну. Кіраўніцтва Польскага радыё падтрымала ініцыятыву рабіць штотыднёвую перадачу. Цяпер «Варшаўскі мост» выходзіць штогчацвер на хвалях «Аўтарадыё». Мне гэтая радыёстанцыя падабаецца за сваю арыгінальную праграмную палітыку. Калі мяне ў Польшчы пытаюцца, што за «Аўтарадыё» такое, то я ім адказваю, што гэта радыёстанцыя не для дурных людзей.

***— Канешне, каб у слухача склалася ўражанне ад нейкага праекта, ён мусіць яго пачуць, але давай крыху падрыхтуем аўдыторыю.***

— «Варшаўскі мост» — гэта «інфармацыйнае шоу», напоўненае музыкай, інфармацыяй, віктарынамі. Мы імкнёмся расказваць тое, што будзе нашым слухачам цікавым. У кожную перадачу запрашаем госця, які распавядае нейкія гісторыі, звязаныя з Польшчай. Ладзілі мы інтэрв'ю з надзвычайным і паўнамоцным паслом Польшчы ў Беларусі Генрыкам Літвіным. Увогуле, кожны чацвер можна пачуць новых людзей: журналістаў, гісторыкаў, грамадскіх дзеячаў. За перамогу ў віктарынах нашы слухачы атрымліваюць падарункі. І калі на пачатку пытанні былі лёгкія, то цяпер, каб адказаць правільна, трэба падумаць. Цікава, што зрабіць віктарыну больш складанай прасілі самі слухачы. Напрыклад, на пытанне «Дзе нарадзіўся Адам Міцкевіч?» адказ мы атрымалі не з першага разу. Многія званілі і гаварылі, што ў Навагрудку, але ў гэтым мястэчку паэта толькі хрысцілі. Насамрэч ён нарадзіўся ў маёнтку Завоссе. За час, які я вяду гэтую перадачу, я пабачыў, што нашыя слухачы — эрудаваныя людзі, яны нябдага ведаюць уласную гісторыю.

***— А чым задавальняеце музычны густ слухача?***

— У плэйлісце ў асноўным актуальныя на творы, фонаграфічная база штомесяц пашыраецца, перыядычна пускаем у эфір хіты. Вяртаемся і да вытокаў польскай музыкі. Часам звоняць слухачы старэйшага пакалення і просяць паставіць песні польскіх выканаўцаў часоў Савецкага Саюзу — Марылі Радовіч, Чэслава Немана, Ганны Герман. Неяк прыйшоў пераможца конкурсу, які выйграў дыск Чэслава Немана. У яго ў вачах была радасць, бо гэты дыск вяртаў яго ў часы маладосці. Увогуле, наш плэйліст можна ахарактарызаваць як поп плюс софтрок. Усе джынглы — фонавыя музычныя застаўкі — адмыслова для перадачы напісаў прафесійны кампазітар. Ад самага пачатку я паставіў мэту рабіць якасную перадачу. Падрыхтоўка да гадзіны эфірнага часу займае як мінімум цэлы дзень. Але вынікі працы радуюць.

***— Пэўна, было нешта цікавае за час працы над праграмай?***

— Аднойчы падчас эфіру нашай праграмы здарыўся кур'ёзны выпадак. Мінскія радыёстанцыі маюць перадатчыкі ў Калодзішчах, а перадатчык «Аўтарадыё» знаходзіцца ў горадзе. Атрымалася так, што ў Калодзішчах былі прафілактычныя працы, і ва ўсёй сталіцы на FM гучала ці не адна нашая радыёстанцыя. Мы думалі, што падчас віктарынаў рэдакцыйны тэлефон расплавіцца ад напругі. Пасля нам пазванілі з Белтэлекаму і сказалі, што мы амаль паралізавалі сувязь у раёне, бо адначасова ў рэдакцыю спрабавалі дазваніцца дзесяць тысяч слухачоў. Але паўтараць такі аншлаг не дужа хочацца — усё ж нядобра перашкаджаць працы Белтэлекаму.

Я не мінімізую намаганняў іншых людзей, якія працуюць на ніве польска-беларускіх адносінаў. Але думаю, што мы робім не менш за іх, бо гаворым з людзьмі простаю мовай. Спадзяюся, перадачу атрымаецца захаваць у эфіры, і праект не толькі не спыніцца, але будзе развівацца.

**Для даведкі:**

Валер Саўко некалькі гадоў жыве і працуе ў Варшаве, хаця сам паходзіць з Гродзеншчыны. Тут, у Беларусі, жывуць яго сваякі, сям'я. «Калі я ў Беларусі, то сумую па Варшаве, калі вяртаюся ў Польшчу, то сумую па Беларусі, — прызнаецца аўтар міжнацыянальнай беларуска-польскай перадачы. — Многа часу праводжу ў дарозе, і нават не хаваю далёка свой чамадан. Я добра ведаю Польшчу, але, на жаль, акрамя маёй роднай Гродзеншчыны, Беларусь я ведаю мала. І ў мяне ёсць задума павандраваць па краіне, каб паглядзець на яе з розных бакоў». Хто ведае, ці не стане вынікам гэтых вандровак пазнавальная перадача на адной з радыёстанцый Беларусі ці Польшчы.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# КРЫЗІС НЕЛЬГА ЎПУСЦІЦЬ, ІМ ТРЭБА КАРЫСТАЦЦА

Вольга ХВОІН

**Фінансавы крызіс падараваў беларускім кампаніям шанец перагледзець падыходы ў вядзенні бізнесу. Да такіх высноў прыйшлі ўдзельнікі міжнароднай бізнес-канферэнцыі «Топ-менеджмент: сіла інавацый», якая адбылася ў Мінску.**




## Шэсць спосабаў стварыць «блакітны акіян»

**Першы спосаб**

Разглядаць у якасці канкурэнтаў не толькі прадстаўнікоў сваёй галіны, але і кампаніі, якія працуюць у альтэрнатыўных галінах. Напрыклад, кіно і рэстараны — цалкам розныя віды бізнесу. Аднак для наведвальнікаў у суботні вечар яны ўяўляюць сабою раўнацэнныя магчымасці прыемнага баўлення часу.

**Другі спосаб**

Адкінуць альтэрнатыву «нізкія кошты або высокая якасць» і зразумець, што апроч кошту і якасці ўплывае на выбар кліентаў. Тэхаская кампанія Curves стварыла свой «блакітны акіян», аб'яднаўшы перавагі наведвання фітнэс-цэнтра і хатніх заняткаў на трэнажорах. Яе фітнэс-цэнтры зручна размешчаныя, пазбаўленыя ўсякай раскошы і недарагія. Але галоўнае, што робіць іх прывабнымі для жанчын, якія саромеюцца сваёй фігуры, — у іх няма цікаўных мужчын.

**Трэці спосаб**

Разгледзець ланцужок пакупнікоў. Не заўсёды той, хто прымае рашэнне пра набыццё, з'яўляецца канчатковым спажыўцом вырабу. Звычайна фармацэўтычныя кампаніі арыентуюцца ў сваёй стратэгіі на лекараў, якія выпісваюць лекі, а не на пацыентаў. Кампанія Novo Nordisk з Даніі, якая вырабляе інсулін, парушыла гэтае правіла, зрабіўшы свой прадукт зручным для пацыентаў. Яна стварыла прыладу для ін'екцый, падобную да аўтаручкі. У ёй ужо ўтрымліваецца патрэбная доза лекаў, і пацыенту застаецца толькі націснуць на кнопку.

**Чацвёрты спосаб**

Прапанаваць дадатковыя прадукты і паслугі, якія маюць каштоўнасць для пакупніка. Так, вугорская кампанія NABI, вытворца рэйсавых аўтобусаў, выявіла, што найбольшыя выдаткі горад нясе не столькі з-за кошту аўтобуса, колькі з-за яго рамонту і абслугоўвання. Яна распрацавала лёгкі аўтобус са шклапластыку, якому не патрэбнае антыкаразійнае пакрыццё, а яго рамонт абыходзіцца значна танней.

**Пяты спосаб**

Спалучаць функцыянальную і эмацыйную прывабнасць тавару для пакупнікоў. У адных галінах канкурэнцыя ідзе ў асноўным за функцыянальную карыснасць тавару, у іншых — за пачуцці пакупнікоў. Але можна паступіць, як фірма Swatch, якая ператварыла вытворчасць гадзіннікаў з функцыянальна арыентаванай галіны ў заканадаўца моладзевай моды.

**Шосты спосаб**

Угледзецца ў заўтрашні дзень і ўбачыць магчымасці для стварэння «блакітнага акіяну». Аўтары прыводзяць у прыклад CNN, якая ацаніла значнасць глабалізацыі і заснавала першую кругласуткавую сусветную сетку навін.

## Больш магчымасцей, чым пагроз

У святле апошніх падзей у эканамічным свеце топ-менеджэры айчынных кампаній і эксперты абмяркоўвалі сучасныя падыходы кіравання прадпрыемствамі, у тым ліку з аглядкаю на неспрыяльныя фінансава-эканамічныя ўмовы.

Дырэктар бізнес-школы Інстытута прыватызацыі і менеджменту Павел Галенчанка лічыць, што ў крызісе больш магчымасцяў, чым пагроз. «Канкурэнтаздольнасць Беларусі цяпер вызначаюць не рэсурсы і не эліта. Яе ў асноўным вызначаюць людзі, якія здольны спажываць і прымяняць навінкі свету, тым самым забяспечваючы сабе лепшае месца пад сонцам, — лічыць эксперт, — Крызіс нельга ўпусціць, ім трэба карыстацца». Цяпер Беларусь мае два магчымыя варыянты дзеянняў. Першы — сціснуцца і перачакаць крызіс, але гэта не эфектыўна. Другі, больш рацыянальны варыянт, заключаецца ў тым, каб трансфармаваць падыходы да вядзення бізнесу.

Найбольш магчымасцей, паводле Паўла Галенчанкі, маюць тыя кампаніі, кіраўнікі якіх адначасова з'яўляюцца і іх уласнікамі, бо іх рукі развязаныя падчас прыняцця рашэнняў і выбару інструментаў для дасягнення пастаўленай мэты. Пры гэтым бізнесоўцам найперш варта звярнуць увагу на эканомію выдаткаў і пашырэнне рынкаў збыту. «Нават страхавыя, інвестыцыйныя, будаўнічыя кампаніі — яны найбольш схільныя патрапіць пад уплыў сусветнага фінансавага крызісу — дзякуючы прадуманым дзеянням могуць выйсці з яго, істотна павялічыўшы сваю долю на беларускім рынку», — лічыць эксперт і папярэджвае, што цяперашніх лідэраў могуць пацясніць тыя, хто будуе свой бізнес не столькі на рэсурсах, колькі на ўкараненні новых тэхналогій.

Павел Галенчанка звярнуў увагу, што Беларусь у інавацыйным плане не горш за іншыя краіны. Праўда, рэальна ацаніць здольнасць айчыннай эканомікі засвойваць інавацыі досыць складана, бо элементарна не хапае дадзеных. Да прыкладу, не вядома колькі насамрэч распрацоўваецца інавацый. Але вядома, што выдаткі прадпрыемстваў на навукова-даследчыя і вопытна-канструктарскія работы складаюць усяго каля 0,1 працэнта ад агульных выдаткаў краіны.

Адзін з кіраўнікоў кансультацыйнай кампаніі «Ключавыя рашэнні» Андрэй Гусакоўскі падтрымлівае свайго калегу, і нават даводзіць, што айчынныя кампаніі ўжо сталі на шлях інавацый. Паводле яго дадзеных, больш за 60 працэнтаў беларускіх кампаній падтрымліваюць інавацыйны клімат. «Цяпер актуальныя інавацыі, накіраваныя не столькі на развіццё, колькі на пошук неардынарнага рашэння», — адзначыў Андрэй Гусакоўскі. Калі раней стратэгічнымі навоўвядзеннямі займаліся выключна кіраўнікі, то цяпер менеджэры сярэдняга звяна атрымліваюць магчымасць праявіць сябе. Як вынік, павышаецца інавацыйны клімат унутры саміх кампаній. Разам з тым, топ-менеджэр папярэджвае, што «універсальнага рашэння няма, кожнае прадпрыемства павінна шукаць уласныя шляхі развіцця».

## Краіна соннага патэнцыялу

Падчас бізнес-канферэнцыі Мінск наведалі сусветныя эксперты ў галіне эканомікі і маркетынгу: Рован Гібсан — эксперт па радыкальных інавацыях з Германіі і кіраўнік кафедры стратэгічнага менеджменту INSEAD (Францыя), дарадца Еўрасаюза, прафесар Чан Кім, ён жа аўтар рэвалюцыйнай тэорыі маркетынгу «Стратэгія блакітнага акіяну». Прафесар Чан Кім даказаў, што «Стратэгія блакітнага акіяну» дае магчымасці рынкавага лідэрства кампаніям і краінам, якія развіваюцца, паколькі яна пабудаваная на адмове ад традыцыйнай канкурэнцыі і стварэнні унікальных рынкаў, на якіх канкурэнцыі не існуе.

Падыход «Стратэгіі блакітнага акіяну» ў свеце ўжо паспяхова практыкуюць многія кампаніі, сярод якіх Ford, NTT DoCoMo і Samsung. Кнігу «Стратэгіі блакітнага акіяну» прафесар Чан Кім напісаў у сааўтарстве са сваёй студэнткай Рэнэ Мобарн пасля аналізу досведу 108 кампаній з 30 галінаў за апошнія сто гадоў. Гэтую кнігу прызналі бестселерам Wall Street Journal і Business Week, яна атрымала статут «нацыянальнага бестселера ЗША» і «міжнароднага бестселера». Чан Кім уваходзіць у пяцьдзесят лепшых мысляроў свету (World Thinkers 50).

Прафесар Чан Кім назваў Беларусь «краінай нявыкарыстаных магчымасцяў». «Вам не трэба нікога пераймаць: ні Амерыку, ні Расію. Беларусь павінна ісці сваім шляхам», — падкрэсліў падчас канферэнцыі гуру сучаснага маркетынгу. «Магчымасці ў краіны вялізныя, пытанне толькі ў тым, як іх сістэматызаваць. Не трэба наноў вынаходзіць кола, шукаць нешта надзвычай арыгінальнае. Ёсць паспяховыя прыклады, якія можна адаптаваць да мясцовых умоў і прымяняць тут. Ад гэтага выйграюць і дзяржава, і людзі. Для гэтага варта стварыць працоўную групу з замежных і мясцовых экспертаў, што дазволіць усебакова ацаніць той ці іншы праект. Акрамя таго, патрэбна павялічыць супрацоўніцтва паміж прыватным і грамадскім сектарам», — падзяліўся сваімі меркаваннямі наконт бізнес-магчымасцяў Беларусі гуру маркетынгавай думкі.

Прафесар адзначыў, што многія постсавецкія краіны маюць высокі патэнцыял у сферы рэалізацыі выключных ідэй, якія дазваляюць стварыць для прадпрыемства доўгатэрміновую прыбытковую рынкавую нішу. Але ў гэтых жа краінах існуе свая спецыфіка, а менавіта дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі і праблемы з камунікацыямі. «Ваш патэнцыял пакуль спіць», — заўважыў Чан Кім. Разам з тым прафесар сказаў, што разгледзеў бы прапанову беларускага ўраду прааналізаваць эканоміку краіны і знайсці для яе адметны рэцэпт паспяховасці.

Паводле спадара Чан Кіма, прапанаваная ім стратэгія ёсць падставай для творчасці ў галіне маркетынгу і эканомікі, бо «нехта бачыць рызыку, а нехта перспектывы». Разам з тым ён звярнуў увагу на тое, што ў часы крызісу важна матываваць людзей, выкарыстоўваць творчыя сілы. «У розныя часы людзей трэба матываваць і даваць ім надзею на будучыню. Людзям патрэбная мара, да якой трэба рухацца», — па-філасофску акрэсліў свой падыход да кадравай палітыкі адзін з лепшых мысляроў свету.

Акрамя таго, прафесар запэўніў, што не варта ў пошуках таннай рабочай сілы імкнуцца ствараць прадпрыемствы па-за межамі ўласнай краіны. У кароткай перспектыве гэта дае бонусы, але атрымліваецца так, што страчваюцца працоўныя месцы ў краіне, ды і цэны на рабочую сілу ў свеце маюць уласцівасць змяняцца.

Увогуле, прафесар Чан Кім лічыць, што «Стратэгія блакітнага акіяну» прымяняльная ў многіх сферах — ад прыватнага жыцця да палітыкі. Толькі варта падыходзіць да яе рэалізацыі творча і час ад часу самастойна даследаваць умовы працы кампаніі. Інакш можа стацца, як у показцы пра караля, які ацэньваў стан спраў у краіне толькі паводле справаздачаў сваіх міністраў. І не ведаў, чым насамрэч жыве яго народ.

ПРАБЛЕМА

# ЗАКЛАДНІКІ МІРНАГА АТАМА

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Наша краіна становіцца закладніцай мірнага атама, так мяркуюць сябры аргкамітэта грамадскай ініцыятывы «Астравецкая атамная — гэта злачынства». Яны рашуча паўсталі супраць пабудовы ў Астравецкім раёне першай на Беларусі АЭС.**






У АН РБ, куды звярнуўся аргкамітэт, неафіцыйна патлумачылі: «Дзе вы былі раней, калі ў рэгіёнах распачыналіся геалагічныя даследаванні? Іншыя пратэставалі, а вы?»

## Паверылі

На пачатку дзяржаўнай кампаніі па даследаванні магчымага месца пабудовы АЭС супраць шчасця мець падобны аб'ект паўстала грамадскасць Магілёўшчыны і Віцебшчыны, а гродзенцы маўчалі. Астравецкі раён — ускраек вобласці. Тут пражывае ўсяго 28 тысяч жыхароў. Да абласнога цэнтра ехаць удвая даўжэй, чым да Мінска. Беспрацоўнае беспрацоўе. З буйных прадпрыемстваў тут толькі кардонная фабрыка ў мястэчку Альхоўка.

Ад пачатку лета адміністрацыя раёна (кіраўнік Адам Кавалька) праз сустрэчы ў працоўных калектывах распачала прамыванне мазгоў наконт важкасці для шараговых грамадзян пабудовы ў раёне АЭС. Абяцалі новыя працоўныя месцы, вялікія заробкі, небывалы росквіт краю. І людзі паверылі. Паверылі, што аператар машыннага даення можа стаць аператарам АЭС.

Мясцовая газета «Астравецкая праўда» ўлетку правяла «круглы стол» наконт важнасці пабудовы ў запаветным Вілейска-Нарачанскім краі атамнага аб'екта. У ім нават паўдзельнічала дэпутат ППНС РБ, першы сакратар ЦК ПКБ Таццяна Голубева. У паседжанні прымалі ўдзел толькі чыноўнікі, і ўсе яскрава выказаліся за пабудову станцыі менавіта ў Астравецкім раёне. Аднак ніхто з іх не казаў пра магчымыя экалагічныя наступствы.

«Большасць людзей баіцца выказаць сваю думку. Яны залежныя ад улады, якая ім дае працу. Гэта настаўнікі, работнікі культуры, кіраўнікі дробных арганізацый, чыноўнікі ўсіх рангаў, а тым болей міліцыянеры, мытнікі, супрацоўнікі КДБ. Паспрабуй выказаць сваю думку — застанешся без кавалка хлеба. Дый удзельнікі «круглага стала» былі адфільтраваныя. Не было там не толькі навукоўцаў, нават простага настаўніка геаграфіі ці біялогіі. Дзе ўжо тут галоснасць...» — лічыць мясцовы грамадскі актывіст, сябра АГП Іван Крук.

## Супраціў

Калі «круглы стол» задаволіў заказчыкаў, то яго вынікі занепакоілі найперш мясцовых грамадскіх актывістаў. Першым паўстаў супраць Мікалай Уласевіч з вёскі Варняны, паблізу якой павінна быць збудавана станцыя. Як географ па адукацыі, ён цудоўна ўяўляе небяспеку для навакольнага асяроддзя ад знаходжання такіх аб'ектаў і наступствы магчымых тэхнагенных катастрофаў. Паважаны ў раёне чалавек, дэпутат мясцовага райсавета двух скліканняў, былы сябра прэзідыума райсавета, на «круглы стол» ён адгукнуўся артыкулам «Астравецкая атамная — гэта злачынства». Але мясцовая газета адмовілася яго друкаваць. Тады Мікалай звярнуўся з заявай у пракуратуру. Адтуль адказу таксама не паступіла.

Уласевічу нічога іншага не заставалася, як зрабіць наступны крок. Ён стаў адным з ініцыятараў стварэння аргкамітэта «Грамадская ініцыятыва «Астравецкая атамная — гэта злачынства». Да яго далучыліся вядомыя прадстаўнікі мясцовай грамадскасці: Іван Крук, былы супрацоўнік міліцыі і дэпутат райсавета; Ягор Александровіч, ветэран ВАВ; Алег Віткоўскі, медык, ураджэнец Астравецкага раёна, зараз жыхар ФРГ; Леанід Букшта, заслужаны настаўнік і іншыя.

І адразу ж на ініцыятараў пачаўся негалосны ўціск. Прыкладам, да сакратара аргкамітэта ініцыятывы Івана Жалецкага завіталі мясцовыя супрацоўнікі КДБ з пытаннем, ці сапраўды ён ставіў свой подпіс пад дакументамі. На працягу некалькіх дзён дадому да Мікалая Уласевіча (які, дарэчы ў гэты час знаходзіўся ў Гродна ў лякарні) прыходзіў сам намеснік начальніка міліцыі раёна, начальнік міліцыі грамадскага парадку, каб, па яго словах, пагутарыць з гаспадаром. Не засталіся без увагі і іншыя ініцыятары стварэння аргкамітэта.

> У радыусе 30 кіламетраў ад АЭС паўстане магільнік радыеактыўных адыходаў. А гэта — раён Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры»

Узнікае пытанне: чаго збіраецца дамагчыся аргкамітэт? Па словах ініцыятараў, найперш яны паставілі на мэце давесці да ведама насельнікаў краю магчымыя наступствы пабудовы АЭС. Якім чынам, калі няма доступу да мясцовых СМІ? Найперш праз пікеты. Былі замоўлены пяць пікетаў: два ў Астраўцы і па аднаму ў населеных пунктах раёна Міхалішкі, Варняны, Гервяты, паблізу якіх прайшлі даследаванні на прадмет пабудовы АЭС. Але ў правядзенні пікетаў мясцовы райвыканкам адмовіў на падставе таго, што «мэты і спосабы правядзення пікетавання перавышаюць патрабаванні закона».

Але гэта не прыпыніла актывістаў. Іван Крук падаў заяву ў суд на дзеянні райвыканкама. І адначасова быў прыняты зварот да ўсіх грамадзян, ураду РБ, Саўміну, Акадэміі навук РБ, Еўрасаюза, МАГАТЭ, прэзідэнта РБ і СМІ. У звароце каротка і важка выкладзены аргументы супраць пабудовы ў Астравецкім раёне АЭС. Галоўныя з якіх — станцыя парушыць чысціню гэтага запаветнага краю і створыць праблемы для цэлага рэгіёна Беларусі.

## Прырода адпомсціць

«Як географ я лічу, што будаваць у Астравецкім раёне атамную станцыю нельга. Існуе думка, што астравецкая пляцоўка па геалагічнаму чынніку нібыта самая бяспечная, а таму прывабная. Сумняваюся. Навукоўцам добра вядома, што напачатку мінулага стагоддзя менавіта ў Астравецкім раёне адбыўся землятрус, у выніку якога ўтварыўся разлом зямной кары. А гэта сведчыць аб вялікай няўстойлівасці гэтай пляцоўкі. Разлом праходзіць у раёне Гудагая, што вельмі блізка ад месца пабудовы АЭС. Спецыялісты пацвярджаюць, што Астравецкая пляцоўка па сейсмічнасці апярэджвае іншыя», — сведчыць Мікалай Уласевіч.

Не трэба быць навукоўцам, каб ведаць, што ружа вятроў у гэтым краі пераважна заходняя і пакрывае большасць тэрыторыі Беларусі. Нават калі тут не будзе надзвычайнай сітуацыі, парэшткі мірнага атама пакрыюць большую частку нашай краіны.

Усе той жа Мікалай Уласевіч сведчыць: «Пакольк мы не маем сваёй уранавай сыравіны, то аўтаматычна станем закладнікамі Расіі ў энергетычных варунках новага ўзроўню».

У якім стане гэты экалагічна чысты край будзе пасля пабудовы тут АЭС, можна толькі меркаваць. У радыусе 30 кіламетраў ад станцыі паўстане магільнік радыеактыўных адыходаў. Гэта раён Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Сарачанскія азёры». Акрамя штучных ставаў сюды ўваходзяць адзінаццаць азёраў. І, згодна з палажэннем заказніка, будаваць падобныя аб'екты не толькі на яго тэрыторыі, але і побач нельга. Нават без спецыяльнага дазволу тут нельга высякаць лес. Пабудова станцыі нішчыць яшчэ адзін прыродны аб'ект. Побач ужо каторы год існуе самая буйная на тэрыторыі Беларусі курортна-санаторная зона — Нарачана-Вілейская раўніна.

Дарэчы, нават раённыя чыноўнікі выказваюцца супраць будучай пабудовы. Напрыклад, кіраўнік аховы прыроды раёна спадар Тумко сцвярджае, што ваду для станцыі будуць браць з ракі Ашмянка, якая сілкуе сваімі водамі Вілію. Не цяжка здагадацца, да чаго гэта прывядзе. Абязводжаная Вілія ператворыцца ў брудную канаву. Што далей? А далей прырода абавязкова адпомсціць. Змяненнем мікраклімату, флоры і фауны, пагаршэннем здароўя не толькі жыхароў рэгіёна, але і ўсёй Беларусі.

## Дзеянні бакоў

Прамыванне мазгоў электарату дабрабытам мірнага атама мясцовыя ўлады працягваюць, хоць актыўнасць у гэтым крыху зменшылася, аднак распачаўся пераслед тых, хто паўстаў супраць станцыі.

Пакуль улады шукаюць спонсараў пабудовы аб'екта, Астравецкі раён наведала дэлегацыя спецыялістаў з Кітая. Па словах сяброў аргаміцэта, кітайцы выказалі гатоўнасць садзейнічаць будаўніцтву АЭС, але пры ўмове, што іх спецыялісты застануцца тут стала жыць і абслугоўваць станцыю.

Іван Крук лічыць, што ў хуткім часе «Беларусь стане закладніцай мірнага атама. Асабліва калі ўлічваць, што побач на ўсходзе Смаленская АЭС. Яшчэ не закрытая Ігналінская атамная станцыя. Месяц таму польскі прэм'ер-міністр Туск аб'явіў, што Польшча пабудуе сваю першую атамную станцыю на мяжы з Літвой, а тая агульная мяжа складае толькі 35 кіламетраў і ружа вятроў уранавыя парэшткі будзе несці на Беларусь. Да атамнага атручвання беларусаў суседзямі нашы ўлады намагаюцца дадаць свой унёсак».

Сябры ініцыятыўнай групы збіраюцца змагацца супраць пабудовы станцыі да апошняга. Але якім будзе вынік гэтага змагання, цяжка сказаць. І справа тут не толькі ў зацікаўленасці цэнтральнай і мясцовай улады. На жаль, большасць жыхароў Астравецкага раёну, якія так стаміліся ад галечы, ужо чакаюць пабудовы АЭС. Бо гэта, як яны лічаць, — працоўныя месцы і вялікія заробкі. А што да прыроды, яна ўсё сцерпіць.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 1 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**05.30** Дакументальны фільм «Дзікае паляванне» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я, ён і праца».
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Груды і раўніны» (Украіна-Расія).
**14.00** «Мелодыі жыцця». Памяці Мусліма Магамаева.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.35** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Х од у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 02.20** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**23.00** Гангстэрскі фільм «Слаўныя хлопцы» (ЗША).
**01.40** Дзень спорту.
**01.55** Усе стыхіі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** Ералаш.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Гібель імперыі». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**17.45** «Жарт за жартам».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Футбол. Чэмпіянат Бразіліі».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Наша справа».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Горад дзяцінства».
**14.35** «Крутыя рабяты». Народнае шоў.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Будзем на ты». Расія, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: канцэрт-акцыя «Каханне супраць Сніду».
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Сталічны футбол».
**01.10** «Гучная справа».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Авантурная камедыя «Пад замком» (Францыя).
**12.20** Слова пісьменніка.
**12.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.40** Мультфільмы.
**14.10** Бухта капітанаў.
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Гіпноз.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 1-я серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.25** Мастацкі фільм «Камедыя строгага рэжыму» (Расія).
**23.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.05** Хакей. Формула гульні.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.05** Фільм «Жаночы кравец». 1990 г.
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** Пакой смеху.
**12.25** Фільм «Здань хаты маёй». 1994 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Формула шчасця Саулюса Сандэцкіса». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Дні анёла».
**21.45** Фільм «Калі нявеста ведзьма».
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Мой срэбны шар».
**00.45** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.05** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.35** Мастацкі фільм «Я цябе люблю».
**15.05** «Рускія не здаюцца!».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «І зноў добры дзень!».
**23.00** Сёння.
**23.30** Прэм'ера. «Ты смешны!».
**00.20** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».
**01.00** Баявік «Навальнічныя вароты».
**01.55** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. Групавы этап. Германія - Японія.
**11.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецы (Галіварэ). Вольным стылем. 4х5 км. Жанчыны.
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецы (Галіварэ). Вольным стылем. 4х10 км. Мужчыны.
**13.00** Снукер. Сусветная серыя ў Расіі (Масква). 2-і дзень.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецы (Галіварэ). Вольным стылем. 4х10 км. Мужчыны.
**16.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швецы (Галіварэ). Вольным стылем. 4х5 км. Жанчыны.
**17.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Расіі. Жанчыны. Адвольная праграма.
**18.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Расіі.
**19.00** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**19.45** Снукер. Сусветная серыя ў Расіі (Масква). 2-і дзень.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Еўрапейскі супер паядынак.
**00.00** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**00.45** Снукер. Сусветная серыя ў Расіі (Масква). 2-і дзень.

## 2 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### 1

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Словы пра Лагойск» цыкла «Зямля беларуская».
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.10** Зона Х.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.30** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**23.00** Рамантычная камедыя «Хлеб і цюльпаны» (Італія- Швейцарыя).
**01.20** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**09.55** «Аляксандр Фацюшын. Апошнія 24 гадзіны».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Гібель імперыі». Шматсерыйны фільм. 5-я серыя з 10.Расія, 2005 год.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Бок няпужаных жаніхоў».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Будзем на ты». Расія, 2006 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Уваскрэсенне класікі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Рэактыўны бокс».
**01.10** «Надзвычайныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 1-я серыя.
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.00** Хакей. Формула гульні.
**12.25** Меладрама «За кім замужам спявачка?» (СССР).
**13.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Бітва экстрасэнсаў.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 2-я серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Швецыя - Беларусь.
**23.00** Спорт-кадр.
**23.35** Містычная драма «Пудра» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Дні анёла».
**11.00** Весткі.
**11.30** Фільм «Калі нявеста ведзьма». 2003 г.
**12.30** Камедыя «Вальс залатых цялят». 1992 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Аляксандр Марынэска. Напад стагоддзя». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Падарожжы музыкі».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Дні анёла».
**21.45** Фільм «Калі нявеста ведзьма». 2003 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Сакрэты вечнай маладосці». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Y.E.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.00** Сёння.
**23.30** Прэм'ера. «Ты смешны!».
**00.20** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».
**01.00** Баявік «Навальнічныя вароты».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.45** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/4 фіналу.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/4 фіналу.
**14.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**15.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/4 фіналу.
**17.15** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/4 фіналу.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.15** Вось дык так!!!
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.30** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі. Камандныя спаборніцтвы.
**21.00, 22.00** Бокс.
**00.00** Матагонкі. Гран-Пры. Агляд сезону.
**01.00** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету ў Іспаніі. Клас Р1.
**01.30** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету ў Партугаліі. Клас Р1.
**02.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 3 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** Альманах вандраванняў.
**14.25** Маладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.55** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлата 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.40** Дэтэктыў «Апостал» (Расія). 1-я серыя.
**23.05** Крымінальна-авантурная камедыя «Лёгкія грошы» (Канада).
**01.05** Дзень спорту.
**01.15** Маладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**10.00** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Гібель імперыі». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Неверагодныя гісторыі пра жыццё».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Зоркі спорту».
**01.05** «Дэтэктыўныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 2-я серыя.
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Своя музыка.
**11.25** Пасоўванне +.
**11.50** Спорт-кадр.
**12.20** Трагікамедыя «Блазан Балакіраў» (Расія). Частка 1-я.
**13.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** «Касмапаліт». Відэаверсія.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 3-я серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.25** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**23.10** «Іншыя». «Віно з дзьмухаўцоў». Частка 2-я.
**23.40** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

---

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.05** Тэлесерыял «Дні анёла».
**11.00** Весткі.
**11.30** Фільм «Калі нявеста ведзьма».
**12.30** Фільм «Меладрама з замахам на забойства». 1992 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Тацццяна Дароніна. Тэатральны раман». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Адмысловы карэспандэнт».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Дні анёла».
**21.45** Фільм «Калі нявеста ведзьма». 2003 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Руская Ніца». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

**06.00** «Сёння».
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.00** «Сёння».
**10.25** «Пакой адпачынку».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «У.Е.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** «Сёння».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** «Сёння».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** «Сёння».
**19.45** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Залатая качка».
**23.00** «Сёння».
**23.30** Прэм'ера. «Ты смешны!».
**00.20** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».
**01.00** Баявік «Навальнічныя вароты».

---

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 3-і дзень. Агляд.
**11.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.45** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/4 фіналу.
**13.30** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 3-і дзень. Агляд.
**14.00** Вось дык так!!!
**14.30** Шары. Міжнародны адкрыты турнір у Вялікабрытаніі. Фінал.
**15.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.30** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 3-і дзень. Агляд.
**17.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Мужчыны. 15 км класічным стылем.
**18.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.15** Вось дык так!!!
**20.30** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі. Камандныя спаборніцтвы.
**21.00** «Формула-1». Тэлечасопіс.
**22.00** Абранае па серадах.
**22.05** Конны спорт. Мастэрс у Бельгіі (Брусэль).
**23.05** Конны спорт. Навіны коннага спорту.
**23.10** Гольф-клуб.
**23.15** Ветразны спорт. Volvo Ocean Race.
**23.20** Яхт-клуб.
**23.30** «Алімпійскія гульні». Тэлечасопіс.
**00.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 4-ы дзень. Агляд.
**00.30** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**02.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 4-ы дзень. Агляд.

## 4 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Ўвядзення ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы.
**09.15, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.20** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** «Будні чэмпіёнаў».
**14.25** Маладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.15** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.55** Вайсковы дэтэктыў «Апостал» (Расія). 2-я серыя.
**23.05** Трагікамедыя «Вяселле».
**01.20** Дзень спорту.
**01.30** Маладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**10.00** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Гібель імперыі». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «След». Шматсер. фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Дакументальны дэтэктыў».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Гарачы лёд».
**01.10** «Сакрэтныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 3-я серыя.
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Невытлумачальна, але факт.
**11.50** Медычныя таямніцы.
**12.25** Трагікамедыя «Блазан Балакіраў» (Расія). Частка 2-я, заключная.
**13.40** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Танцы без правіл.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). 4-я серыя.
**20.00** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.10** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Беларусь - Расія. Прамая трансляцыя.
**22.45** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**00.35** «Проста праграма».

---

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.05** Тэлесерыял «Дні анёла».
**11.00** Весткі.
**11.30** Фільм «Калі нявеста ведзьма». 2003 г.
**12.30** Фільм «Неадстраляная музыка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Савецкая імперыя. Ледакол «Ленін». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Дні анёла».
**21.45** Фільм «Калі нявеста ведзьма». 2003 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Вялікі містыфікатар. Казімір Малевіч». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.10** «Залатая качка».
**10.00** «Сёння».
**10.25** «Асоба небяспечны!».
**10.55** «Дужанне за ўласнасць».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «У.Е.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** «Сёння».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** «Сёння».
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.45** «Да бар'ера!». Ток-шоў.
**23.00** «Сёння».
**23.30** Прэм'ера. «Ты смешны!».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Медыум».
**01.00** Баявік «Навальнічныя вароты».

---

**09.30** «Алімпійскія гульні». Тэлечасопіс.
**10.00** Фехтаванне. Турнір «Мастэрс» у Францыі (Левалуа Перэ).
**10.30** «Формула-1». Тэлечасопіс.
**11.30** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 4-ы дзень. Агляд.
**12.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**13.30** Вось дык так!!!
**14.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 4-ы дзень. Агляд.
**14.30** Снукер. Зала славы.
**15.30** Шары. Міжнародны адкрыты турнір у Вялікабрытаніі. Фінал.
**16.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**18.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Камбінацыя. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі».
**23.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Камбінацыя. Слалам. Прамая трансляцыя.
**00.15** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. 4-ы дзень. Агляд.
**01.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету.

## 7 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.15** Моладзевы серыял «Сэрца акіяна» (Францыя).
**06.40** Камедыйная меладрама «Нявеста і забабоны» (ЗША- Вялікабрытанія).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.10** Культурныя людзі.
**10.50** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Музычная камедыя «Волга-Волга» (СССР).
**14.15** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** Моладзевая меладрама «Суперзорка» (ЗША).
**18.00** Суперлато.
**19.00** Прэм'ера. Меладрама «Чырвоны жэмчуг кахання» (Расія-Украіна).
**20.40** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.05** Драма «Кожная нядзеля» (ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** Разумніцы і разумнікі.
**12.25** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм.
**13.35** «Зваротны адлік».
**14.05** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Міжнародная панарама».
**16.40** Тэорыя неверагоднасці. «Інтуіцыя».
**17.25** Нядзельны «Ералаш».
**17.45** Прэм'ера. «Агульная тэрапія». Шматсерыйны фільм. 11-я серыя.
**18.50** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.55** Фільм «Дом лётаючых кінжалаў».
**01.05-01.40** «Камедзі Клаб».

**06.35** «Сакрэтныя гісторыі».
**07.25** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм «Сюрпрыз». ЗША, 2007 г.
**09.25** «Аўтапанарама».
**09.55** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.35** «Добры дзень, доктар!».
**13.10** Фільм «Шпік пецярбургскай паліцыі». Расія, 1992 г.
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**17.55** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Тыгровыя атрады «. Францыя, 2006 г.
**22.55** «Спартовы тыдзень».
**23.25** «Чэмпіянат свету па ралі 2008». Шатландыя.
**00.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Староннім уваход забаронены» (СССР).
**11.20** Медычныя таямніцы.
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**12.40** Клуб былых жонак.
**13.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.45** Кінааповесць «Развітанне славянкі» (СССР).
**16.20** Пасоўванне +.
**16.35** Гаспадар.
**17.05** «Спявай, душа. by». Фальклорны ансамбль «Журавушка» ( Столінскі раен).
**17.35** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**19.05** Прафесійны бокс.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Правы чалавека.
**21.00** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Нёман (Гродна) - Юнасць (Мінск).
**23.00** Хакей. НХЛ. Караліна - Філадэльфія.
**00.35** Свая музыка.
**01.05** Пасоўванне +.

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Экранізацыя рамана «Чырвонае і чорнае». 1976 г. 4-я серыя.
**08.25** Мультфільмы. «Гаршчок смеху «.»Вожык і дзяўчынка».»Кураня ў клетачку».
**08.50** «Студыя Здароўе».
**09.25** «Дзяжурны па краіне».
**10.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Прэм'ера. «Асцярожна, мозг!». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага-3. Фільм 2. «Залаты стрэл». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны - 3». 1992 г.
**16.20** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Фільм «Вяртанне блуднага таты». 2006 г.
**22.10** Прэм'ера. «Імя Расія».
**23.20** Вострасюжэтны фільм «Амерыкэн бой». 1992 г.
**01.25** Заканчэнне эфіру.

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.55** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Эксцэнтрычная камедыя «Рататуй».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**17.05** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.10** «Галоўны герой».
**22.20** «Рускія не здаюцца!».
**22.55** Прэм'ера. «Наша тэма».
**23.30** Драма. «Афёра Стывена Гласа».

**08.30** Ветразны спорт. Monsoon Cup у Малайзіі. Прамая трансляцыя.
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Тронхейм). Каманда.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Спрынт. Мужчыны.
**12.00** Біятлон. Кубак мір у Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**12.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Францыі (Ла Клюсаз). Мужчыны 4х10км. Фінал. Прамая трансляцыя.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Тронхейм). Каманда.
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Тронхейм). HS 131. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Тронхейм). Прамая трансляцыя.
**17.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**18.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**19.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Канадзе. Супергігант. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША. Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба.
**21.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**22.45** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**23.15** Вось дык так!!!
**23.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. Фінал.
**01.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі».
**02.00** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» распачынае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.

(сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________

(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ____
Всего ____

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ____
Всего ____

Кассир

ЦІКАВА

# ЗАЧЫНІЦЬ ГУАНТАНАМА: ЛЯГЧЭЙ СКАЗАЦЬ, ЧЫМ ЗРАБІЦЬ

Алег ПЯТРОЎ

**Адным з важных пунктаў выбарчай кампаніі Барака Абамы было абяцанне зачыніць турму для тэрарыстаў у Гуантанама. Наколькі гэта рэальна?**



Турма Гуантанама знаходзіцца на тэрыторыі амерыканскай вайсковай базы на паўднёва-ўсходнім беразе Кубы. Тут служыць 9000 амерыканскіх вайскоўцаў. Статус базы вельмі не звычайны хаця б з таго, што Куба і ЗША не маюць дыпламатычных адносін. Гавана патрабуе выводу янкі з Кубы, і спасылаецца пры гэтым на міжнароднае права. Вашынгтон жа сцвярджае, што міжнароднаму праву якраз супярэчаць заявы кубінцаў.

З'явіліся амерыканцы ў Гуантанама напрыканцы XIX стагоддзя падчас вайны з іспанцамі. Куба ад кантролю Мадрыду была вызвалена, аднак толькі для таго, каб трапіць пад кантроль Вашынгтону. Першым прэзідэнтам заснаванай кубінскай рэспублікі стаў амерыканскі грамадзянін, які ў 1903 годзе пагадзіўся перадаць Штатам поўны кантроль над Гуантанама.

У 1934 годзе дамову пераглядзелі, і ЗША пагадзіліся плаціць за арэнду тэрыторыі штогод 20 тысяч долараў ЗША. У пераліку на цяперашнія кошты гэта прыблізна тры мільёны долараў.

1 студзеня 1959 года партызанскія атрады Кастра і Чэ Гевары ўступілі ў Гавану. На першым этапе рэвалюцыі палітычная фізіяномія новага рэжыму была не вызначаная. Сам Кастра паходзіў з арыстакратычнага роду. У Штатах яго руху шмат хто сімпатызаваў, і нават дапамагаў грашыма. Напрыклад, блізкая да Дэмакратычнай партыі «New York Times» напісала пазітыўны нарыс пра Фідэля і яго сяброў — мужных змагароў з дыктатарам. Таму спачатку Фідэль ігнараваў пытанне Гуантанама.

Пра базу пайшла размова, калі адносіны з Вашынгтонам канчаткова пагоршыліся. На пачатку 60-х Кастра патрабаваў выводу флоту ЗША з Гуантанама. Штаты адмовіліся, спасылаючыся на дамову 1934 года. З тых самых часоў спрэчка працягваецца. Бакі нават судзіліся ў міжнародным судзе ў Жэневе, аднак безвынікова. Прычым ЗША акуратна плацяць арэнду залатымі зліткамі. Кастра тыя грошы не траціць, а захоўвае ў сейфе свайго офісу як доказ прынцыповасці.

Натуральна, за апошнія 50 гадоў знешні выгляд базы вельмі змяніўся. Да пачатку рэвалюцыйных падзей звычайныя кубінцы маглі вольна наведваць базу. Фактычна гэта быў маленькі горад. Тут нават працаваў свой тэатр і дзейнічала радыё. Шмат хто з кубінцаў працаваў на базе. Напрыканцы 50-х рэжым уваходу на базу для грамадзян Кубы стаў больш жорсткім. У 60-я амерыканцы стварылі вакол базы штучны плот з кактусаў, які цягнецца на восем кіламетраў. У 1962 годзе падчас ракетнага крызісу сем'і вайскоўцаў былі эвакуяваныя з базы, аднак у 1964-м ім дазволілі вярнуцца. У тым жа годзе адбылася яшчэ адна значная падзея: кубінцы перакрылі пастаўкі вады ў Гуантанама, і амерыканцам давялося вазіць яе з Ямайкі. У 1986 годзе тут адчыніўся першы на Кубе МакДональдс.

Аднак Гітма, як яшчэ называюць базу ў Гуантанама, славутая іншым. Прыблізна з 70-х гадоў база стала выкарыстоўвацца як часовая турма для бежанцаў з Кубы і жыхароў Ямайкі, які спрабавалі водным шляхам нелегальна дабрацца да Амерыкі. Гэта была невялікая ўстанова, разлічаная на 30–50 вязняў. Але з 2002 года колькасць вязняў павялічылася да некалькі сотняў. Гэта галоўным чынам былі сябры Аль-Каіды, захопленыя падчас вайны з афганскім талібамі. Было вырашана стварыць на базе спецыялізаваную турму для тэрарыстаў. Прычым рэжым іх утрымання з самага пачатку не адпавядаў міжнародным канвенцыям. Вязні Гуантанама носяць кайданы. Яны часам не маюць права на перапіску з роднымі. Ніхто не ведае, калі іх будуць судзіць, па якіх законах і за што. Нічога дзіўнага, што ў чэрвені 2006 года трое вязняў Гітма пакончылі жыццё самагубствам.



Парадкі ў Гуантанама выклікалі абурэнне міжнародных праваабарончых арганізацый. Amnesty International, ААН і Еўрапейскі Саюз некалькі разоў патрабавалі правесці больш-менш адкрыты судовы працэс над людзьмі, якія ўтрымліваюцца ў турме Гуантанама. І вось нарэшце праблема быццам вырашаная: Абама абяцае зачыніць Гітма. Аднак эксперты ставяцца да гэтага крытычна.

Першая праблема: што рабіць з былымі тэрарыстамі? Лагічна было б перадаць іх урадам краін, адкуль яны паходзяць. Некаторыя ўрады, напрыклад Саудаўская Аравія, гатовыя забраць сваіх грамадзян. Аднак самую вялікую частку вязняў Гуантанама складаюць выхадцы з Йемену — краіны, дзе палітычная сітуацыя не стабільная. Некаторыя рэгіёны Йемена ўвогуле не кантралююцца цэнтральным урадам. Натуральна, няма гарантый, што былыя тэрарысты ў такіх умовах не вернуцца да сваёй дзейнасці.

Калі тэрарыстаў нельга адпускаць па месцу прапіскі, значыць, іх трэба судзіць на тэрыторыі ЗША. І зноў праблема: ніводны кангрэсмен, які прадстаўляе інтарэсы таго ці іншага штату, не дасць згоды праводзіць падобны суд там, дзе жывуць яго выбаршчыкі. Матыў зразумелы — гэта патэнцыйна можа зрабіць край аб'ектам атак тэрарыстаў і паставіць крыж на кар'еры.

Трэцяя праблема — прававая. Больш-менш адкрыты суд — гэта супрацьстаянне бакоў. Аднак такая галіна права, як барацьба з тэрарызмам, вельмі слаба распрацаваная. Прафесары юрыспрудэнцыі прызнаюць, што тэрарысты, калі атрымаюць добрых адвакатаў, змогуць давесці сваю невінаватасць.

Што застаецца ў такой сітуацыі Абаме? Большасць спецыялістаў кажа, што ён паспрабуе проста перавесці вязняў з Гуантанама ў Баграм — турму ў Кабуле, дзе ўтрымліваюцца палонныя талібы. Парадокс у тым, што Баграм сваімі турэмнымі парадкамі ўжо заслужыў рэпутацыю другога Гуантанама.

Адзінае выйсце для Абамы і яго каманды — распрацаваць працэдуру хуткага і адкрытага суду над тымі, каго падазраюць у міжнародным тэрарызме.

"Гуантанама — гэта сімптом больш вялікай праблемы, — кажа адзін са спецыялістаў па праву. — Так ці інакш, нават калі праблема цяперашніх вязняў Гуантанама будзе вырашаная, іх месца не доўга будзе вольным. Амерыканцы і іх саюзнікі ўвесь час захопліваюць у палон новых сяброў тэрарыстычных груповак, і закон пра барацьбу з тэрарызмам проста неабходна найхутчэй прыняць».

Праблема ў тым, што, каб распрацаваць новы эфектыўны закон, патрэбны час, а выбаршчык любіць, каб абяцанні, дадзеныя палітыкам падчас кампаніі, выконваліся хутка.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Між тым, на думку аналітыкаў, афіцыйны Мінск намагаецца апраўдаць чаканні Еўрасаюзу, які да красавіка замарозіў візавыя санкцыі супраць Аляксандра Лукашэнкі і яшчэ 35 беларускіх чыноўнікаў. Патрабаванне пра забеспячэнне свабоды прэсы ёсць сярод 12 умоў, якія раней Еўрасаюз сфармуляваў для нармалізацыі адносін Беларусі і ЕС.

**«BBC» (Вялікабрытанія)**

Магчымасць укласці капітал ў краіну з эканомікай, якая хутка развіваецца, з 10 мільёнамі людзей (уключаючы кваліфікаваных працоўных), з цэнтральным месцам знаходжання ва Усходняй Еўропе і добрымі дарогамі, можа зацікавіць інвестараў. Аднак патрэбна больш часу, пакуль заходнія бізнесмены пераканаюцца, што Лукашэнка трымае слова. Для Лукашэнкі няма лёгкіх адказаў. Ёсць толькі разуменне таго, што танец, які ён вядзе, каб утрымаць уладу, становіцца яшчэ больш складаным.

**«The Guardian» (Вялікабрытанія)**

Па неафіцыйнай інфармацыі, каменем супярэчнасцяў у перамовах з МВФ стала пытанне ўтрымання курсу беларускага рубля ў адносінах да долару. Улады не пагаджаліся з тым, што ва ўмовах крызісу і адмоўнага сальда знешняга гандлю неабходна дэвальвацыя рубля. Між тым, на падтрымку нацыянальнай валюты ў верасні-кастрычніку спатрэбілася больш за 500 мільёнаў долараў з рэзерваў, або дзевятая іх частка. Адначасова ў апошнія два тыдні адзначаецца плаўнае падзенне курсу рубля. Гэта дае экспертам падставы казаць аб тым, што Беларусь і МВФ дасягнулі разумення.

**«Коммерсант-Ъ» (Расія)**

Для Беларусі пачатак скарачэнняў у прамысловай сферы можа мець найгоршыя наступствы сярод краін СНД. Дзяржава шмат гадоў дэкларавала стабільнасць і прадказальнасць беларускай мадэлі дзяржаўнага сацыялізму. Крызіс, які пачаўся, калі верыць дэкларацыям беларускіх уладаў, закрануў краіну не вельмі моцна дзякуючы якраз дзяржаўна арыентаванай форме яе гаспадаркі. Аднак бліжэйшым часам Расія, якая з'яўляецца галоўным спажыўцом беларускіх тавараў, можа сутыкнуцца з дэфіцытам сродкаў на аплату іх закупак. І калі з боку Масквы не будзе прынятае альтруістычнае рашэнне працягваць набываць беларускую прадукцыю, каб захаваць сацыяльную стабільнасць у саюзнай Беларусі, наступствы для эканомікі могуць быць вельмі змрочнымі.

**«Газета 24» (Украіна)**

Пакуль што Беларусь адзіная краіна з СНД, якая ўжо папрасіла крэдыт у Расіі. Памер крэдыту невялікі — 2 мільярды долараў, — аднак ён будзе выдадзены ў два этапы. Але грошы Мінску патрэбныя ўжо зараз, і таму Бацька звярнуўся таксама да МВФ.

**«Kiev Post» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ

На сустрэчы з генеральным сакратаром ААН Пан Гі Мунам федэральны міністр абароны Франц Ёзэф Юнг паабяцаў, што Германія працягне ўдзельнічаць у міжнароднай барацьбе з піратамі ў прыбярэжных водах Самалі. Аднак для процідзеяння піратам міжнароднай супольнасці неабходны выразны план аперацыі. Але спачатку, па яго словах, будзе праведзена праца па стварэнні нацыянальнай прававой базы.

Па словах міністра, федэральны ўрад прыме ўдзел у барацьбе з піратамі ў рамках міжнароднага мандата і накіруе адзін вартаўнічы карабель. Але для ажыццяўлення гэтай місіі патрабуецца яшчэ згода бундэстага.

Зараз бундэсвер у рамках аперацыі «Нязломная воля» («Enduring Freedom») аказвае дапамогу ў рамках неабходнай абароны. Вартавому караблю «Карлсруэ» ўжо ўдалося адбіць два напады піратаў ля ўзбярэжжа Афрыканскага Рога.

### КОСАВА

Еўрасаюз разлічвае завяршыць разгортванне місіі ЕС у галіне законнасці і права (EULEX) у Косава ў пачатку снежня. Магчыма, гэта будзе 2 снежня, заявіў вярхоўны прадстаўнік ЕС па агульнай знешняй палітыцы і бяспецы Хаўер Салана.

Місія ЕС будзе ўключаць 1900 чалавек міжнароднага персаналу і 1100 косаўскіх спецыялістаў. Сербія дагэтуль рашуча пярэчыла супраць размяшчэння EULEX, якое пачалося ў сакавіку, заяўляючы, што мае намер мець справу толькі з місіяй ААН. Місія мае мандат Савета бяспекі арганізацыі, якім прызнаецца тэрытарыяльная цэласнасць Сербіі.

22 лістапада косаўская паліцыя затрымала трох грамадзян Германіі па падазрэнні ў дачыненні да выбуху. Згодна з паказаннямі сведак, адзін з немцаў зайшоў у пусты будынак побач з прадстаўніцтвам Еўрасаюза, адкуль, як мяркуецца, была кінута выбуховая прылада. У выніку выбуху нікто не пацярпеў. Прадстаўнік германскага ўрада назваў абсурднай інфармацыю аб дачыненні грамадзян Германіі да выбуху каля прадстаўніцтва ЕС.

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ

Закон, накіраваны супраць шлюбаў па прымусе, уступіў у сілу ў Вялікабрытаніі. Тым, хто прымушае сваіх дзяцей уступаць у шлюб насуперак іх волі, зараз пагражае да двух гадоў турмы.

Праблема асабліва востра стаіць у мусульманскім асяроддзі, дзе шлюбы па прымусе — звычайная практыка. Апошні час увагу грамадскасці прыцягнулі выпадкі звязаных з гэтым самагубстваў і так званых «забойствы гонару».

Звычайна ахвяры шлюбаў па прымусе не звяртаюцца ў паліцыю, таму што не жадаюць, каб у іх бацькоў былі непрыемнасці. Але яны вельмі няшчасныя, і часта наносяць сабе калецтвы, і нават здзяйсняюць самагубствы.

Праблема датычыцца, галоўным чынам, дзяўчын-мусульманак, але і хлопцы таксама далёка не заўсёды могуць ажаніцца па каханні: «Мая маці паставіла мяне перад выбарам — ажаніцца або застацца без спадчыны. Я абраў другое», — кажа адна з ахвяр шлюбу па прымусу.

Сёлета ў паліцыю ўжо паступіла больш 1500 заяў у сувязі з прымусам да шлюбу.

Юнакі і дзяўчыны, якія выраслі ў Вялікабрытаніі, далёка не заўсёды жадаюць падпарадкоўвацца старажытнай традыцыі. Па новым законе, улады могуць забяспечыць ім абарону, а таксама перашкодзіць іх адпраўцы за мяжу, дзе часта заключаюцца такія шлюбы.

### ГРЭНЛАНДЫЯ

У Грэнландыі прайшоў рэферэндум пра больш шырокае права на аўтаномію самага вялікага ў свеце вострава. Грэнландыя з'яўляецца рэгіёнам Даніі, што мае самакіраванне і шмат у чым незалежны ад Капенгагена, але такія галіны, як абарона і знешняя палітыка, застаюцца ў кампетэнцыі дацкага ўрада.

Цяперашні рэферэндум дасць магчымасць самастойна распараджацца распрацоўкай нетраў і марскіх рэсурсаў, самастойна дзяліць прыбытак ад іх продажу.

Як лічаць палітолагі, рэферэндум можа стаць першым крокам Грэнландыі да незалежнасці. Супраць гэтага зусім не пярэчаць у Даніі, змешчанай на іншым беразе акіяна.

Аднак сумневы ў неабходнасці суверэнітэту — ва ўсякім разе, паспешлівага — ёсць у самой Грэнландыі. У першую чаргу, грэнландцаў хвалюе недзавальняльная эканамічная сітуацыя і сацыяльныя праблемы. Рэферэндум, як лічыцца, павінен крыху выправіць становішча.

### ТАЙЛАНД

Тайландскія апазіцыянеры абстралялі групу прыхільнікаў урада, аб гэтым паведаміла мясцовае тэлебачанне. 10 000 чалавек, якія падтрымліваюць апазіцыйны Народны альянс за дэмакратыю, акружылі будынак старога аэрапорта Дон-Муанг, які служыць часовай рэзідэнцыяй прэм'ер-міністра краіны. За дзень да гэтага дэманстранты блакавалі будынкі парламента і шэрагу міністэрстваў.

Апазіцыя прадпрымае гэтыя дзеянні, каб перашкодзіць працы ўрада, які вінавацяць у карупцыі. Народны альянс патрабуе адстаўкі прэм'ера Санчата Вангсавата, які, як заяўляюць апазіцыянеры, працягвае палітыку былога кіраўніка краіны і свайго зяця мільярдэра Таксіна Чынавата.

Масавыя выступы апазіцыі пачаліся ў краіне яшчэ ў жніўні, тады маніфестанты занялі будынак парламента, які дагэтуль утрымліваюць у сваіх руках. Новы ўсплёск хваляванняў адбыўся ў нядзелю, пасля таго, як Санчат Вангсават заявіў, што па-ранейшаму не мае намеру сыходзіць у адстаўку, нягледзячы на незадаволенасць насельніцтва.

ФІЛЬМ

# КОМПЛЕКС ПАДЗЕННЯ

Іван БІЧ

**Цяперашняя Германія падзеленая паміж прыхільнікамі і апанентамі аднаго фільму. Самая цікавае, што фільм Бернда Эйхінгера «Комплекс Баядэра-Майнхоф», пра які пойдзе мова, параўноўваюць з фільмам «Untergang» («Падзенне») — першым фільмам пра Гітлера, які быў зняты ў сучаснай Германіі.**




Здымаць стужкі пра фюрэра ў Германіі раней лічылася парушэннем палітычнай этыкі. Тое ж самае адбылося з фільмам «Комплекс Баядэра-Майнхофа». Рэжысёр спакусіўся на тое, пра што казаць нельга, або нельга казаць у іншай трактоўцы.

Мова ідзе пра лявацкую тэрарыстычную групоўку «Фракцыя Чырвонай арміі» (RAF). RAF была заснаваная напрыканцы 60-х актывістамі левага студэнцкага руху.

Захопленыя дзейнасцю Чэ Гевары і Фідэля Кастра, якія з дапамогай партызанкі скінулі дыктатуру Батысты, маладыя немцы вырашылі імпартаваць вопыт партызан краін Трэцяга свету ў ФРГ.

Сваё права на гвалт і экстрэмізм яны аргументавалі тым фактам, што шмат кіраўнікоў тагачаснай ФРГ у 30–40-я гады займалі вышэйшыя пасады ў апараце нацысцкай Германіі. Пры ўсім сваім рамантызме і адсутнасці вопыту баявых дзеянняў групоўка здолела навесці дзікі жах на дзяржаўныя інстытуты. «Фракцыя Чырвонай арміі», якая ў лепшыя часы налічвала максімум 80 чалавек, рабавала банкі, захоплівала самалёты, забівала чыноўнікаў першага дывізіёну.

Дасюль цяжка зразумець, як былыя студэнты, галоўным чынам гуманітарных факультэтаў, здолелі рэалізаваць такія складаныя аперацыі, кшталту рабавання трох берлінскіх банкаў за адзін дзень, або выкрадання міністра, якога абаранялі першакласныя спецы ў галіне асабістай аховы. У рамках барацьбы з RAF у краіне былі абмежаваны грамадзянскія правы і ўведзена забарона для людзей радыкальных левых поглядаў займаць дзяржаўныя пасады.

Самае дзіўнае, што як мінімум тройчы паліцыя і спецслужбы знішчалі кіраўніцтва арганізацыі. І ўсякі раз знаходзіліся людзі, гатовыя перахапіць крывавую эстафету. Афіцыйна RAF склала зброю толькі напрыканцы 90-х. Адзначым, прыпыніла супрацьў не пад ціскам рэпрэсій, а добраахвотна. Аднак ужо ў 2001 годзе з'явіліся нейкія людзі, якія пачалі браць на сябе адказнасць за гвалтоўныя акцыі ад імя RAF.

Абавязкова трэба адзначыць, што RAF як феномен не мог адбыцца без дапамогі з таго боку берлінскай сцяны. У рамках шырокай антыімперыялістычнай салідарнасці палесцінцы і лівійцы арганізавалі для баевікоў RAF курсы вайсковай падрыхтоўкі. Усходняя Германія ў выпадку правалу сяброў RAF заўсёды была гатовая надаць ім ПМЖ.

Пры ўсім відавочна гвалтоўным характару ўчынкаў RAF, крытыкаваць групоўку ў ФРГ доўгі час лічылася палітычна некарэктна. Усе дваццаць фільмаў пра RAF, што былі знятыя раней, малююць яе актывістаў як нейкіх рамантыкаў, якія занадта моцна паверылі ў ідэі справядлівасці і роўнасці.

На тое ёсць свае прычыны. Па-першае, RAF знешне здаецца рухам сапраўдных ідэалістаў. Сярод заснавальнікаў былі не маргіналы, а маладая нямецкая эліта. Ульрыка Майнхоф, адна з ініцыятараў стварэння падпольнай арганізацыі, — лепшая журналістка ФРГ канца 60-х. Яе калега па тэрарыстычнаму цэху Гудрун Энеслін — прамы нашчадак Гегеля. Абараняць арыштаваных сяброў RAF выклікаўся сусветна вядомы філасаф Жан-Поль Сартр.

Па-другое, цікавы лёс удзельнікаў маладзёвых пратэстаў 60-х, для якіх RAF калісьці была атрыбутам маладосці. Зараз яны — палітычны істэблішмент. Некаторыя з іх ведалі тэрарыстаў RAF асабіста. Напрыклад, былы міністр замежных спраў Йошка Фішэр ад Партыі зялёных нейкі час падазраваўся ў тым, што дазволіў чырвонаармейцам пераначаваць у сябе дома.

Фільм Бернда Эйхінгера — першая спроба паглядзець на феномен RAF па-іншаму. Галоўная ідэя рэжысёра — давесці, што RAF — гэта не падкантрольны свядомасці гвалт. Магчыма, тэрарысты і пачыналі як рамантыкі, аднак хутка забойства стала для іх пэўнай устаноўкай. Чымсьці стужка нагадвае вядомы фільм Алівера Стоўна «Народжаныя забойцамі» пра парачку, якая забівае, каб атрымаць эмацыйнае задавальненне. Забойства — адзінае, што складае для іх сэнс жыцця.

Карціна стала падзеяй у культурным жыцці Германіі. Кожная газета краіны палічыла сваім абавязкам адрэагаваць на фільм. Вось фрагменты некаторых рэцэнзій.

«Фільм зроблены прафесійна. Аднак 20 мільёнаў еўра (столькі каштавалі здымкі), не апраўдалі сябе. Гісторыя краіны распавядаецца як нейкі калаж».

«Фільм не адлюстраваў гістарычнай рэальнасці. Самае небяспечнае, што гэты фільм спрабуе па-іншаму аналізаваць гісторыю Германіі пасля другой сусветнай вайны».

«Наўрад ці такі фільм знішчыць міф вакол RAF. Наадварот, ён надасць яму новы імпульс».

«Тое, што банда тэрарыстаў RAF называецца бандай тэрарыстаў, гэта правільна, аднак з фільму не зразумела, якія прычыны прымусілі людзей стаць на гэты шлях».

А вось што думаюць пра фільм родзічы ахвяр RAF. Міхаэль Бубак, чый бацька-пракурор быў забіты RAF, лічыць, што стужка трактуе гісторыю занадта проста. Ігнес Понта, муж якой загінуў ад рук тэрарыстаў, здзівіў той факт, што нямецкі ўрад фінансаваў здымкі карціны.

А вось Йорг Шлейер, чый бацька, старшыня Канфедэрацыі прадпрымальнікаў, таксама быў забіты, лічыць, што RAF паказаны ў фільме такімі, якімі яны былі: «бандай забойцаў, які не ведалі літасці».

Карціна, дарэчы, намінавана на прэмію «Оскар» як лепшы замежны фільм. Часопіс «Hollywood Reporter» напісаў, што фільм някепскі. Выданне пахваліла сцэнар, аднак палічыла, што акцёры гуляюць слаба. Іншае ўплывовае выданне, «Variety», увогуле заявіла, што фільм занадта эмацыйны.

Магчыма, якраз галівудчыкі паставяць кропкі над «і» ў дыскусіі вакол значэння карціны. Калі падчас раздачы прэмій «Оскар» яны ўзнагародзяць фільм, рэвізія з'явы RAF будзе легалізаваная. Інакш — RAF, як і раней, застанецца прыгожай легендай. Міф, які на самай справе сапраўды мала адпавядае рэальнасці. Напрыклад, адзін з бацькоў RAF Хорст Малер, якога арыштавалі яшчэ ў 70-я і доўга трымалі ў турме, пасля амністыі напачатку 80-х сышоў у неанацысты.

А некаторыя кажуць, што фільмы «Комплекс Баядэра-Майнхоф» і «Падзенне» нельга параўноўваць.

МЕРКАВАННЕ

# Жан-Жак Дардэн: ЯКАСЦЬ НАШАГА ЖЫЦЦЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОСМАСУ

**25–26 лістапада ў Гаазе прайшла нарада еўрапейскіх міністраў, якія курыруюць пытанні асваення космасу. Нарада праводзіцца раз на тры гады. У павестцы дня — зацвярджэнне гадавога бюджэту Еўрапейскага касмічнага агенцтва і план працы на бліжэйшыя гады. Напярэдадні гэтай нарады генеральны сакратар Еўрапейскага агенцтва Жан-Жак Дардэн даў інтэрв'ю тэлеканалу «Еўраньюс».**



— Адной з асноўных мэтаў еўрапейскай касмічнай палітыкі з'яўляецца паляпшэнне якасці жыцця на Зямлі. Гэта праграмы, якія закранаюць інтарэсы ўсіх грамадзян, у прыватнасці, праграма маніторынгу Зямлі GMES (Global Monitoring for Environment and Security). Яна накіраваная на назіранне за Зямлёй і яе атмасферай, за экалагічнай бяспекай. Другая — гэта праграма запускаў на геастацыянарную арбіту метэаспадарожнікаў трэцяга пакалення.

Ёсць яшчэ адна праграма, накіраваная на далейшае развіццё сістэмы «Галілеа». Гутаркі аб удасканаленні «Галілеа», якая пакуль яшчэ не пачала функцыянаваць, могуць камусьці здацца дзіўнымі, але трэба заўсёды прадугледжваць наступны этап развіцця, які дазволіць палепшыць якасць навігацыйных сістэм, што выкарыстоўваюцца ў паветры, на моры і на зямлі.

Яшчэ маецца шэраг праграм, якія датычаць навукова-тэхнічнага развіцця і ўдасканалення наяўных ведаў па даследаванні космасу. Мы жадаем вывучыць планеты, вывучыць Сусвет гэтак жа сама, як мы вывучылі Зямлю.

Важна, каб еўрапейская прамысловасць з поспехам канкуравала на сусветных рынках. Гэта элемент, ад якога залежаць эканамічны дабрабыт і занятасць людзей. Таму важным кірункам касмічнай камерцыйнай дзейнасці з'яўляюцца тэлекамунікацыі. Каб падвысіць канкурэнтаздольнасць усёй прамысловасці, трэба паляпшаць тэлекамунікацыйныя тэхналогіі.

Але самае галоўнае — палёты ў космас. Без палётаў немагчыма выкарыстаць касмічную прастору. Доступ да космасу забяспечвае носьбіт «Арыён–5», а праз год да нас далучацца караблі «Саюз» і «Вега». Тады ў нас з'явіцца поўны спектр ракета-носьбітаў. Даследаванне космасу — гэта не толькі развіццё навукі, удасканаленне тэхналогій і падвышэнне канкурэнтаздольнасці, але таксама мары, звязаныя з паляпшэннем якасці жыцця людзей. Праграма засваення космасу ўключае ў сябе міжнародныя даследаванні спачатку Месяца, затым Марса. І Еўропа павінна стаць паўнапраўным удзельнікам гэтых праграм.

***— Ці маюцца ў вас козыры, якія дазволяць пераканаць тых, хто распараджаецца сродкамі, у неабходнасці рухацца наперад?***

— Еўропа, нягледзячы на значна меншыя сродкі, чым вылучаюцца на даследаванні космасу ў іншых месцах, лідзіруе ў шматлікіх кірунках — як у даследаваннях, так і ў касмічных запусках. Наша доля на рынку запускаў складае 60 працэнтаў, а ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя на планеце яна нават большая. На мой погляд, Еўрапейскае касмічнае агенцтва з'яўляецца сусветным лідэрам у даследаванні Зямлі і яе экалогіі. Думаю, што дзеля гэтага неабходны большыя інвестыцыі, бо гэта інвестыцыі ў будучыню. Я ведаю, што сёння мы перажываем вялікія эканамічныя цяжкасці, але інвестыцыі, прызначаныя на засваенне космасу, павінны быць незалежныя ад штогадовых ваганняў эканомікі. Вылучаныя сёння інвестыцыі прынясуць свой плён толькі праз 10 гадоў.

***— Вельмі часта простыя людзі не разумеюць, што даюць гэтыя інвестыцыі. Што вы можаце ім патлумачыць?***

— Вы ведаеце, што было б, калі б на адзін дзень адключыць касмічныя спадарожнікі? Ні адзін чалавек не зможа нармальна жыць без космасу. Без дапамогі сістэмы касмічнай навігацыі ні адзін шафёр у Парыжы сёння не зможа працаваць. Самалёты не змогуць пералятаць з аднаго кантынента на іншы. У вас не будзе метэапрагнозу на бліжэйшыя 5 дзён, а фермеру давядзецца працаваць без адпачынку, бо ён не ведае, якое будзе надвор'е. А калі б адключэнне спадарожнікаў супала з фіналам чэмпіянату свету па футболе, заўзятары не ўбачылі б матч у прамым эфіры — тады ўсім стала б ясна, наколькі якасць нашага жыцця залежыць ад космасу.

***— А што вы думаеце пра касмічныя праграмы Індыі і Кітая?***

— Спачатку супернiцтва ішло паміж СССР і ЗША. Еўропа на дзесятак гадоў адстала. Сёння Еўропа нагнала ў сферы тэхналогій і навукі, але ў фінансаванні сваіх праграм па-ранейшаму адстае. У апошнія гады мы сталі сведкамі з'яўлення на сцэне новых гульцоў. Гэта не толькі Кітай і Індыя, гэта таксама Японія і Бразілія. Космас займае ўсё важнейшае месца, і ўсё больш краін яго асвойваюць. Міжнароднае супрацоўніцтва ў даследаванні космасу — гэтае супрацоўніцтва не толькі вялікіх касмічных дзяржаў. Мы працуем разам з краінамі, якія самі пакуль не могуць лётаць у космас, але ім патрэбен доступ да касмічнай прасторы. Гэта краіны Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі, Усходу. Ім патрэбны магчымасці, якія дае космас для барацьбы з засухай, для развіцця сельскай гаспадаркі, адукацыі, медыцыны. Космас — гэта важны вектар развіцця краін, якія не валодаюць магчымасцямі самастойна яго выкарыстоўваць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### РАУЛЬ КАСТРА



Да ўсіх іншых праблемаў Раўля апошнім часам дадалася яшчэ адна. Імя ёй — Барак Абама. Справа ў тым, што абранне чарнаскурага палітыка на пасаду прэзідэнта ЗША ўзняло пытанне расізму сярод чарнаскурых грамадзян Вострава Свабоды. Адпаведна статыстыцы, 65 працэнтаў насельніцтва Кубы белыя, 25 — метысы, а 10 працэнтаў маюць чорную скуру. Рэжым камуністаў заўсёды ганарыўся тым, што даўно вырашыў расавую праблему. Натуральна, пасля абрання Абамы Гавана захацела прадэманстраваць, што мясцовыя негры жывуць не горш за амерыканскіх. Аднак калі справа дайшла да статыстыкі, аказалася, што сітуацыя, мякка кажучы, неадназначная. Чарнаскурыя кубінцы, як правіла, зарабляюць у паўтары разы менш, сярод кіруючага персаналу яны складаюць мізэрны працэнт, ім нават неафіцыйна забаронена працаваць ва ўстановах, супрацоўнікі якіх абслугоўваюць інтурыстаў. У кубінскім парламенце чарнаскурыя дэпутаты складаюць 16 працэнтаў. Найбольш ахвотна іх бяруць на працу ў якасці спартсменаў, паліцэйскіх і музыкантаў. Сітуацыяй вакол правоў чарнаскурых кубінцаў адразу скарысталіся арганізацыі, якія вядуць прапагандысцкую барацьбу супраць рэжыму Кастра. Адзін з антыкастраўскіх цэнтраў у ЗША адкрыта выказаў занепакоенасць станам правоў расавых меншасцяў на Кубе.

### НІК ГРЫФІН



З праварадыкальнай Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP), старшынёй якой з'яўляецца Грыфін, здарыўся дзіўны казус. Нехта скраў спіс яе сяброў у электронным выглядзе і выклаў дакумент у інтэрнэце. Такім чынам, кожны чалавек цяпер можа даведацца не толькі прозвішчы ўсіх 13 тысяч сяброў арганізацыі, але таксама іх месца працы і хатні тэлефон. Нягледзячы на тое, што BNP апошнія гады дэманструе ндрэнныя вынікі на мясцовых выбарах, і нават атрымала прадстаўніцтва ў гарадскім савеце Лондану, партыя і яе актывісты ў грамадстве лічацца фашыстамі. Не дзіўна, што некаторыя, калі пабачылі кантакты нацыяналістаў, пачалі тэлефанаваць ім і абражаць. Часам людзям пагражалі. Непрыемнасці чакалі сяброў BNP таксама на працоўных месцах. Шмат хто з іх раней не афішаваў сваю партыйную прыналежнасць. Зараз ім пагражае звальненне, паколькі наяўнасць у офісе расіста можа пагоршыць імідж фірмы. Сярод ахвяр хакераў ёсць некалькі паліцэйскіх, якія таксама ў вольны ад працы час мелі кантакты з правымі радыкаламі. Прэса лічыць, што хутчэй за ўсё базу дадзеных выклаў нехта з нацыяналістаў, хто меў зуб на Грыфіна. Тым больш, што пару месяцаў таму ад BNP адкалолася крыло незадаволеных курсам старшыні. Сам Грыфін сцвярджае, што мела месца правакацыя спецслужбаў, якія звязаныя з урадавай партыяй лейбарыстаў. Між тым, самі лейбарысты заявілі, што кожны грамадзянін мае права па закону быць сябрам любой палітычнай структуры. Міністр паліцыі публічна паабяцаў сябрам BNP, што ніхто з іх не будзе звольнены па палітычных матывах.

### НІНО БУРДЖАНАДЗЕ



Адзін з аўтараў грузінскай аранжавай рэвалюцыі, былы саюзнік Міхаіла Саакашвілі, Ніно Бурджанадзе, якая нейкі час таму сышла ў адстаўку з пасады спікера, зноў вярнулася ў вялікую палітыку. У адным з тбіліскіх спартзалаў, акурат на пятую гадавіну рэвалюцыі, адбыўся з'езд створанай пад Ніно партыі — «Дэмакратычны рух — Адзіная Грузія». Новая фармацыя заявіла пра сваё апазіцыйнае стаўленне да існуючага ў краіне рэжыму. Галоўным тактычным заданнем партыі ёсць правядзенне ў краіне датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў. Апошнія мелі месца прыблізна год таму, аднак рэйтынг Міхаіла Саакашвілі, які на іх перамог, аказаўся падкошаным пасля вайсковага канфлікту з Расіяй. У прынцыпе, як паказалі апошнія акцыі аб'яднанай апазіцыі, якія ледзь сабралі 200–300 чалавек, электаральны рэсурс у прэзідэнта застаўся, і ён мог бы пайсці на новыя выбары. Праблема ў тым, што грузінская канстытуцыя не дазваляе абірацца прэзідэнтам больш чым на два тэрміны, і ў выпадку новых выбараў Саакашвілі не будзе мецъ права балатавацца. Такім чынам, патрабаванні Бурджанадзе апрыёры будуць праігнараваныя ўрадам. Цяжка сказаць, якім чынам яе партыя, якая не мае СМІ і фракцыі ў парламенце, збіраецца змагацца. Праўда, злыя языкі кажуць, што за праектам Ніно стаяць амерыканцы, якіх дастаў непрадказальны Саакашвілі. Магчыма, пад іх ціскам прэзідэнт пойдзе на саступкі Бурджанадзе.

▸ РЭЦЭНЗІЯ

# ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ ПРЫСТУПКІ

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

**Калі б я была не крытыкам, а кінарэжысёрам, сцэнарыстам ды аператарам, я б узяла раман Артура Клінава «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца», ягоны ж фотаальбом «Горад СОНца», камеру, закінула б за пазуху натхненне ды выправілася б на шпацыр па Мінску. Мапай быў бы фотаальбом, а гідам ды гістарычнай даведкай — раман.**

Падчас навучання ў школе, што было не так шмат гадоў таму, я зрэдку вырывалася са сваёй Ангарскай у цэнтр ды, шпацыруючы з сяброўкамі дзе-небудзь каля цырку ці ўздоўж Свіслачы на Нямізе, задавалася пытаннем: «Ну што тут можна ўбачыць?» Сяброўкі заўсёды мяне падтрымлівалі: «Сапраўды, што тут рабіць турыстам?» Мы сыходзіліся на тым, што нам выпала нарадзіцца ў самым звычайным ды непрыкметным горадзе, і адпраўляліся на Купалаўскую, каб праз паўгадзіны кінуцца ў абдымкі роднага Заводскага раёну.

Але нягледзячы на гэтыя юнацка-неасэнсаваныя разважанні мушу прызнацца: Мінск я заўсёды любіла той неўсведамляльна-пяшчотнай любоўю, у якой захлынаешся пад грукат колаў цягніка, што імчыць цябе праз дажджлівую раніцу на Цэнтральны чыгуначны вакзал.

Атрымаўшы ў падарунак фотаальбом Артура Клінава «Горад СОНца», я прысвяціла наступны дзень падарожжу па родным горадзе. Гучыць дзіўна, але факт: мінчукі ведаюць свой горад нашмат горш за правінцыялаў ці замежнікаў. Дык вось. Кінула я ў кайстру фотаальбом і здымач і выправілася ў заліты сонцам цэнтра, да Палаца Рэспублікі (ці па-тутэйшаму Саркафагу), які стаўся першым адлюстраваным будынкам у альбоме.

## Праект гарманічнага грамадства

Першы раман Артура Клінава з'яўляецца працягам «візуальнай паэмы пра Мінск». Прагледзець альбом ды не прачытаць кнігу — справа няўдзячная: пры такім раскладзе не атрымліваеш стоадсоткавага задавальнення ад спасціжэння таямніцаў (а часцяком і фактаў даўно вядомых, але інтэрпрэтаваных па-новаму) такога роднага і такога дасюль незнаёмага гораду. Ад гэтай пэўнай таемнасці, у якую заглыбляе нас «Малая падарожная кніжка», Мінск набывае асаблівы шарм і прыцягальнасць. Ён паўстае «простым і загадкавым, як чорны квадрат Казіміра Малевіча».

Раман гэты — сумесь падарожнай кніжкі, успамінаў ды філасофскіх разважанняў. Галоўным пытаннем, што хвалявала аўтара, сталася пытанне Шчасця («…калі Шчасце ўсё ж такі ёсць, то яго адчуванне занадта індывідуальнае, каб падлягаць якому-колечы абстрактнаму абагульненню»). Далей на арэну выступае Яе Вялікасць Утопія, якой, па-сутнасці, і з'яўляецца ідэяй пабудовы Краіны Шчасця (у гістарычным кантэксце — СССР) ды і, па вялікім рахунку, існавання Гораду Сонца (у кантэксце сучасным — Мінску). Формула шчасця паводле Утопіі выглядае так: Багацце, Задавальненне, Уладанне, Унутраная ды Сацыяльная Гармонія, Каханне, Любоў да Бога. І ўсё гэта — «у адным праекце гарманічнага грамадства — Гораду Сонца». Калі палічым гэту формулу за парадыгму, то, адпаведна, ядром станецца Багацце. Каханне ды любоў да Бога сціпла адсунутыя на апошнія месцы: іх наяўнасць, мяркуючы па ўсім, не абавязковая. Прычым заўважце: Любові да Чалавека месца ў формуле так званага «Шчасця» не знайшлося.

Што да Утопіі, то аўтар падрабязна разглядае гэты панятак у дачыненні да роднага гораду. Абапіраючыся на аднайменны раман Томаса Мора, Артур Клінаў стварае сваю сістэму каардынат, у якіх спалучаюцца ды суіснуюць у адной прасторы пад імем Горад Сонца (СОНца) Метафізік, Моц, Мудрасць ды Любоў. Толькі Любоў да чаго (каго)? Мудрасць ды Моц у чым (кім)? Патлумачу словамі самога Клінава: «Тое, што Горад Сонца ўвасобіўся менавіта ў Мінску, не было выпадковым капрызам гісторыі. Горад, чый лёс пачаўся з могілак — з Нямігі крывавых берагоў, — сам зрабіўся месцам памерлых гарадоў. Ці магло быць лепшым месца для пабудовы Гораду Сонца — Утопіі, Вострава, якога няма, населенага Народам, якога няма, у Горадзе, якога няма?» Ці магло? — запытаемся ў сябе і пагаджаемся з аўтарам: не, не магло.

«Ідэальны Горад Утопіі павінен мець аднаго Аўтара, Вялікага Архітэктара, Дырыжора. Імя гэтага Архітэктара — Дыктатура». Жаданне стварэння такой Утопіі Артур Клінаў тлумачыць проста: «Ніводзін народ, які жыве ў не-Справядлівасці і не-Шчасці, не будзе пазбаўлены мары ажыццявіць Горад Сонца». Пра нас? Несумненна. І далей: «Грамадства Шчасця — усяго толькі салодкі Сон». Дый рэцэпт Ідэальнага грамадства не такі ўжо і складаны: яно магчымае, «калі Сон стане мацнейшым за Рэальнасць». Чытаю гэтыя радкі ды разважаю: так то яно так, але ж, як пісала Людміла Рублеўская: «Каханне — сон. І я магу прачнуцца». Тое самае і са Шчасцем. Аднойчы спадарыня Рэальнасць бахне па галаве чарговым сюжэтам БТ — ілюзіі і знікнуць ураз.

## Не больш за кіло ў адны рукі!

Горад у рамане раскрываецца ў некалькіх кантэкстах: гістарычным, архітэктурным, сучасным. «Я нарадзіўся ў Сонечным Горадзе Мрояў, дзе паўсталі два Гарады — Грамадства Шчасця, у якое верылі, ды сам Горад». Узгадваецца песня N.R.M. «Менск—Мінск». Вось і атрымліваецца, што тое, у што верылі ды на што спадзяемся і зараз — Менск, а тое, што маем («сам Горад») — Мінск.

Першым успамінам Артура Клінава пра Горад Сонца стала «вялізная бетонная сцяна, на якую я спрабую залезці…» Вось такой сцяной, дакладней сценамі, якімі маленькаму Артуру ўбачыліся прыступкі лесвіцы, падаюцца мне тыя перашкоды, якія некалькі стагоддзяў замінаюць нам здзейсніць сваю спрадвечную мару — «з панскіх выпутацца пут». Тэма не новая для белліту, але, на жаль, дужа актуальная. З гэтым не паспрачаешся, часам ад гэтага не сыдзеш ды не збяжыш.

Мне шчыра шкада тых пачаткоўцаў, якія лічаць сваім абавязкам колькі твораў прысвяціць тэме занядбаных беларусаў, якім то з Захаду хвост прыціснуць, то з Усходу паветра перакрыюць. Своеасаблівая даніна павагі атрымоўваецца. Так бы мовіць, ахвяра на алтар роднай літаратуры. Няўжо так цяжка (ці проста лянота, што больш выглядае на праўду) вынайсці свой, адрозны ад усіх спосаб, мастацкі прыём, тэму, праз якія перадаць не становішча Беларусі, а сваё суб'ектыўнае бачанне гэтага стану?

Артура Клінава пачаткоўцам ніяк не назавеш, але раман гэты — ягоны першы літаратурны дзіцёнак. Вельмі абнадзеіла мяне тое, што ён не паглыбляецца ў «пашкадуйце нас, бедных, няшчасных беларусаў», а распавядае пра «народ, які перажыў многія стагоддзі няволі» з вышыні чалавека, які жыве сённяшнім днём, паказвае сучаснікам сваё бачанне-адчуванне падзеяў гэтага дня. Прычым робіць гэта проста і з гумарам.

А звароты да гісторыі, якіх досыць шмат у рамане, толькі для таго, каб дапамагчы нам зразумець пэўныя моманты, якія патлумачыць падзеямі дня сённяшняга немагчыма. Кожная ўзгаданая эпоха — штрых да партрэту Горада Сонца.

«Краіна нагадвала Імперыю, але не была ёю. Яна магла быць Імперыяй, але стала Дэмакратыяй. У выніку гэта і згубіла яе» (пра Вялікае княства Літоўскае).

«Тытанік, што раскінуўся ад мора да мора, ішоў на дно, маючы ў сваім целе дзевяць прабоінаў — дзевяць вялікіх войнаў, адна з якіх была смяротнай» (пра Рэч Паспалітую).

«Народ, які перажыў многія стагоддзі няволі, з жарсцю жадаў яе» (пра Расейскую імперыю).

«У маім дзяцінстве ў Горадзе Сонца Бога ўжо не было. Калі я пытаў выхавацельку ў дзіцячым садку: «Чаму яго няма?» яна адказвала мне проста: «Гагарын лётаў у космас, але Бога там не бачыў». «Імперыя працягвала вычышчаць



абшары гэтай зямлі ад Культуры, гарадоў і народаў» (калі ціснулі ўспаміны пра СССР). І яшчэ: «Тое, што мы жывем у самым шчаслівым грамадстве, я ведаў абсалютна дакладна. Гэта ведалі ўсе дзеці Гораду Сонца. Памятаю, як мы спачувалі тым іншым дзецям, што жывуць у спарахнелым капіталістычным свеце ды пазбаўленыя шчаслівай будучыні».

Падсумоўваючы ўсё вышэй сказанае, аўтар піша: «У розныя часы ён быў то каталіцкім, то праваслаўным, то уніяцкім, то іудзейскім, барокавым, губернскім, савецкім, імперскім. Аднак пасля кожнай смерці Горад адраджаўся не ў працяг папярэдняй традыцыі, а як іншае Месца».

Тэма жыцця ў СССР раскрываецца аўтарам найбольш поўна. Што натуральна: нарадзіўся і вырас Артур Клінаў падчас уладарання Метафізіка (Брэжнева). Чытаючы ўспаміны пра гэтыя часы, мяне не пакідала думка пра забітую ў 2004 годзе беларускую журналістку Вераніку Чаркасаву, артыкулы якой сабралі яе сябры ў кнізе «*Красным по белому*» (выдадзена пасмяротна). Вераніка вельмі часта звярталася да часоў СССР, паказвала сітуацыю ў краіне такой, якой яна была насамрэч. Гэткага ж прынцыпу прытрымліваецца і Артур Клінаў. Пра, я б сказала, легендарную нястачу прадуктаў харчавання ён піша: «Калі давалі нешта дэфіцытнае, нерваваліся і крычалі: «Больш за кілаграм у адны рукі не даваць!»

Звяртаючыся да масавых рэпрэсій у СССР, Клінаў узгадвае пра Курапаты, што пад Горадам Сонца: «Лік ахвяраў Імперыі за гэтыя гады (маюцца на ўвазе 30-я) цяжка паддаецца вылічэнню. Вядома, што толькі на адным з месцаў масавых пакаранняў у Курапатах пад Мінскам расстралялі ад ста да двухсот пяцідзесяці тысяч чалавек». Быццам зазіраючы наперад ды працягваючы разважанні-ўспаміны Артура Клінава, Вераніка Чаркасава ў артыкуле «*Три карты точек, где лежат без могил десятки тысяч репрессированных белорусов*» піша: «*Между тем, Куропаты — далеко не единственное место, где в Беларуси в годы сталинских репрессий расстреливали и захоранивали людей. Об остальных мы просто не знаем, а точнее — предпочитаем не знать*».

## Голас крыві

Напрыканцы раману Артур Клінаў вырываецца-такі за межы сонечнага Гораду і мы трапляем… у Вільню, настолькі беларускі горад, што там усіх літоўцаў лічыш за замежнікаў. Калі мы з сябрам шпацыравалі па залітай сонцам Вільні, ён сказаў: «Ведаеш, Ася, не пакідае мяне адна думка: усё ж такі добра, што Вільня засталася за Літвой пасля 1939-га, а то…» Ён меў рацыю: ездзілі б мы зараз не ў прасякнутую сапраўдным беларускім духам Вільню, а ў жоўташэры горад саўковай забудовы.

Думаю, спадар Клінаў з намі пагадзіўся б, бо апісанне старых гравюраў Мінску ім падаецца так: «На іх красаваўся вельмі еўрапейскі горад, па стылі шмат у чым падобны да Вільні…» А пасля гаспадарання Саветаў: «Гэты горад быў іншы, такі непадобны да Гораду Сонца». «Я пакахаў Вільню адразу, з першага ўздыху», — прызнаецца Клінаў. Маю цвёрдую ўпэўненасць, што закохваюцца ў яе ўсе шчырыя беларусы. Гэта наш Горад. Гэта наша Вільня. Зрэшты, апісваць гэты горад — справа няўдзячная. Каб яго зразумець, трэба на сабе адчуць ягоны подых, пачуць «голас крыві» ды «цішыню спрадвечных муроў».

Калі б я пісала не рэцэнзію, а сцэнар, калі б маім «інструментам» была не папера, што «ўсё вытрымае», а кіно, якое вытрымае ўсё і яшчэ больш, я замест эпілогу зняла б такі кадр: маленькі хлопчык пераадольвае чарговую прыступку, якая падаецца яму сцяной. Пераадольвае са шчаслівай усмешкай шчаслівага маленькага насельніка шчаслівага Гораду Сонца. Магчыма, калісь ён напіша: «Ці быў я шчаслівы ў Краіне Утопія? Мусіць, так. Да той пары, пакуль я верыў у яе». Але гэта будзе зусім іншая гісторыя.

СТАНДАРТЫ

# ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ СТАЛЯМІ

## АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ АЛЬТЭРНАТЫЎНЫХ КЛУБАЎ

Алесь ГІНЗБУРГ, Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Што ведае пра нашу краіну сярэднестатыстычны еўрапеец? «Апошняя дыктатура Еўропы». Такая рэакцыя на рэпліку: «Я з Беларусі», добра вядомая ўсім, хто хоць раз уступаў у жывы кантакт з жыхаром Захаду. Але гэта далёка не ўвесь еўрапейскі імідж РБ. Знаёмства з выпадковым чэхам прыўносіць нечакана новыя фарбы ў стэрэатып Беларусі. «Беларусь — краіна, дзе людзі п’юць піва на вуліцах», — упэўнена скажа ваш новы чэшскі знаёмы.**



Няўжо такога бескультур’я нельга пабачыць на вуліцах іншых постсавецкіх дзяржаваў? Некалькі год таму чэшская тэлевізія зняла фільм пра Беларусь. У цэлым пазітыўны, ён падаваў жыццё ў нас з самых розных аспектаў, паказваў яго станоўчыя і адмоўныя моманты. Аператары не маглі не падкрэсліць знакамітыя чысціню мінскіх вуліцаў і прыгажосць беларускіх дзяўчатаў. Але і супраць сметніцы, у якую ператвараюцца некаторыя кварталы цэнтру ўвечары перад выхаднымі, таксама не прайшлі. Каларытныя кадры моладзі, якая ладзіць вечарынкі пад адкрытым небам, шакавалі чэшскага гледача.

### «Сустрэнемся на Нямізе…»

Берагі Свіслачы і за кампанію падземнай Нямігі не касцьмі рускіх сыноў засеяныя, як гэта было ў летапісныя часы. Бутэлькамі ад піва, гарэлкі і пакункамі ад чыпсаў засеяны яны ў пятніцу вечарам.

Аўтарам гэтых радкоў неаднаразова даводзілася ўдзельнічаць у калектыўным свінстве. Зараз яны паспрабуюць апраўдацца. Іх праблема ў тым, што ў іх няма «свайго» бару. Месца, куды яны могуць заскочыць пасля працы, выпіць піва па дэмакратычным кошце, сустрэцца з сябрамі. Больш за тое, трапіць у першы-лепшы бар гораду вечарам не ўяўляецца рэальным. А калі гэта і здараецца, пачувацца ўтульна там не выходзіць. Фарбаваныя ў аднастайныя колеры памяшканні, аднолькавыя жалезныя крэслы — рэстаранны бізнес РБ безаблічны. Можна крыху даплаціць і спыніцца ў больш «дарагім» рэстаране з галовамі аленяў на сценах і драўлянымі столікамі — але і гэты кіч-дызайн «пад старасветчыну» аднастайны па ўсёй краіне.

Клубы і арт-кавярні з цікавымі інтэр’ерамі і нестандартнай культурнай праграмай, у якіх сапраўды хочацца бываць, лёгка пералічыць па пальцах, а трапіць туды можна адно па білетах. Калі ж табе раптам заманецца арганізаваць канцэрт ці літаратурны вечар самому, у пошуку пляцоўкі для мерапрыемства можна звар’яцець. У Мінску бракуе не толькі дэмакратычных рэстарацый для сярэдняга класу, пра што даўно трубяць выданні па эканоміцы і турызме. Бракуе любога кшталту пляцовак, дзе звычайна засяроджваецца альтэрнатыўная культура.

### Кафэ ў шафе

Трапляннe ў любы еўрапейскі горад, больш-менш супастаўны з Мінскам па памерах (2 мільёны жыхароў), назаўсёды можа адвярнуць беларускага студэнта ад бліскучасці інтэр’ераў гандлёвага цэнтру «Сталіца». Гіганцкіх будынкаў, узведзеных з улікам усіх дасягненняў сучаснай архітэктуры, кшталту Нацыянальнай бібліятэкі, хапае паўсюль. Але як альтэрнатыва шклу і бетону афіцыйнай урбаністыкі ў гэтых самых гарадах ёсць неафіцыйная. Гэта маленькія сувенірныя крамкі, галерэі, кнігарні, кавярні, вегетарыянскія ядальні, тэатрыкі і кіназалі, — і вялізныя начныя клубы. І багемныя, і гламурныя, і рэспектабельныя, і «олдскульныя» — на любы густ.

У аднаго з аўтараў гэтага артыкулу здарыўся моцны культурны шок, калі сябры прывялі яго папіць гарбаты ў кракаўскае «Cafe Szafy ». Інтэр’ер складаюць пафарбаныя ў яркія цацачныя колеры шафы, якія служаць тут чым заўгодна: барнай стойкай, канапай, сталом ці нават дзвярыма ў суседні пакой. Кавярня традыцыйна прадстаўляе свае памяшканні літаратарам для сустрэч з чытачамі. Тут ладзяцца музычныя імпрэзы, а таксама майстар-класы па маляванні і акцыя «Польскія акторы чытаюць казкі дзецям». Уладальнікі кавярні — мастакі — перыядычна мяняюць выставы карцінаў на сценах: каб заўсёднікам не прыядалася.

Вельмі адрозніваюцца ад ахайнай кавярні для эстэтаў «Cafe Szafe» кракаўскія клубы «Lubu-Dubu» ці «Прыгожы пёс» у стылі «old school». Мэбля нічога не каштавала гаспадарам. Яна сабраная па закінутых будынках, вы не знойдзеце двух аднолькавых крэслаў ці канапаў. Сталы хістаюцца ў такт наведнікам, іх можна не пытаючыся дазволу совать па залі ў любой камбінацыі. Тыя, хто хоча таньчыць, спускаюцца ў падвал-танцпол. Над галовамі — трубы ў фользе і пакля. Гэта гукаізаляцыя, якая надзейна абараняе ад шуму жыхароў зверху. На выхадных тут не прапіхнуцца: прыходзяць выпіць, пагутарыць і патаньчыць як жыхары Кракава, так і турысты.

### Альтэрнатыва на літару «Г»

Сітуацыя з клубамі ў Кракаве — звычайная для Еўропы. Чаму ж такое немагчыма ў Беларусі, у Мінску — горадзе студэнцкім? Няўжо няма дызайнераў, якія гэта намалююць, маркетолагаў, якія разрэкламуюць, музыкаў, якія выступяць, і заўсёднікаў, якія ацэняць? Ды ўсё ёсць. Мара «заснаваць сваю кавярню» — яна універсальная, традыцыйная і цалкам натуральная для гадаванца як заходняй культуры, так і ўсходняй, яе спрадвеку песцяць самыя розныя людзі па ўсім свеце. Толькі вось у сучаснай Беларусі зроблена ўсё, каб такую мару было як найцяжэй ажыццявіць.

Адзіны наяўны прыклад альтэрнатыўнай установы ў стылі «олдскул» у Мінску — «Графіці». Вельмі часта людзі ходзяць на імпрэзы, што там ладзяцца, проста таму, што іх ладзіць гэты клуб. Цесная памяшканне ў форме... літары «Г». Планіроўка няручная, гэта самае апошняе месца, дзе можна ўявіць сабе канцэрт ці паказ спектаклю. Установа раз на год абвяшчае закрыццё — то арэнду падымуць, то санэпідэмстанцыя аштрафуе. Піва там таннае і айчыннае, але быў час, калі яго паўгода не прадавалі: кліентаў прасілі прыходзіць «са сваім». Бо ў тым самым будынку арандуе памяшканні адна недзяржаўная навучальная ўстанова.

### Кантроль і ўзгадненне

Беларускі рэстарацыйны бізнес — ці, як ён называецца ў нас, «прадпрыемствы грамадскага харчавання» — частка беларускай бізнес-прасторы з усімі ўласцівымі ён недахопамі, у прыватнасці: неспрыяльнымі заканадаўчымі ўмовамі, залішняй бюракратычнасцю, і найгоршае — празмерным удзелам у бізнесе Яе Вялікасці Дзяржавы.

Гэта можна адсачыць па працэдуры рэгістрацыі юрыдычнай асобы і атрымання ліцэнзіі на пэўны від дзейнасці. Напрыклад, пералік працэдур, якія ажыццяўляе адміністрацыя раёну ў дачыненні да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, утрымлівае больш за 20 пунктаў: заява, копіі статутных дакументаў, звесткі пра гандлёвыя плошчы і г.д. Але нам больш цікавая канкрэтыка: чаму ў беларускім горадзе цяжка адкрыць кавярню ці клуб кшталту кракаўскіх «Cafe Szafe», ці «Lubu-dubu». Таму спынімся больш падрабязна на: 1) заключэнні раённага органу санітарнага нагляду; 2) заключэнні раённага органу МНС.

Закон РБ «О санитарно-эпидемическом благополучии населения», на падставе якога дзейнічаюць органы санітарнага кантролю, абавязвае юрыдычныя асобы і ІП выконваць пастанаўленні органаў санкантролю. Згаданыя органы выносяць заключэнні, ці адпавядаюць умовы суб’екта гаспадарання санітарным нормам, зафіксаваным у нарматыўна-прававых актах. Гігіенічныя патрабаванні да аб’ектаў грамадскага харчавання ўтрымліваюцца ў дакументе пад назвай «Санітарныя правілы і нарматывы» 1 для кожнага віду дзейнасці асобны дакумент. Менавіта ў «СанПіНе» для *«общепита»* пералічаныя пункты, па якіх кракаўскую «Шафу» пазбавілі б ліцэнзіі толькі за асвятленне і мэблю.

Але нават атрымаўшы заключэнне органу саннагляду і ліцэнзіі, «прадпрыемства грамадскага харчавання» знаходзіцца пад сталай пагрозай праверак санстанцый, якія маюць мала дачынення да «эпидемического благополучия населения», але з’яўляюцца дзейсным сродкам уплыву дзяржавы на бізнес, бо цягнуць за сабой штрафы і пазбаўленне ліцэнзіі.

Апрача Міністэрства аховы здароўя, рэстаранную дзейнасць кантралюе і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Закон РБ № 2403–XII «О пожарной безопасности» таксама абавязвае. Шматлікія нарматывы, на падставе якіх «пажарныя» робяць заключэнні і ажыццяўляюць праверкі, — састарэлыя. Яны супярэчаць адно аднаму і выклікаюць немэтазгодна вялікія выдаткі.

Таксама шмат якія праблемы ўтварае дамова аб арганізацыі грамадскага харчавання паміж прадпрыемствам грамадскага харчавання і мясцовым выканаўчым органам. Згаданая дамова, як правіла, абавязвае «благоустраивать территорию» (класці брук, касіць газоны, упрыгожваць фасады да дзяржаўных святаў), адпавядаць нацэнкавай катэгорыі, выкарыстоўваць сыравіну збольшага айчыннай вытворчасці і г.д. Парушэнні, як няцяжка здагадацца, вядуць да пазбаўлення ліцэнзіі.

Падсумуем. Асноўная праблема рэстарацыйнага бізнесу ў Беларусі — імкненне дзяржавы яго кантраляваць. Што не дае яму развівацца праз здаровую канкурэнцыю. Сродкі ажыццяўлення дзяржаўнай кантролю — заканадаўства. Прамая дарога рэстаратару пад манастыр — «СанПіН» і ППБ. Гэта не кажучы пра закон, які абавязвае «пункты грамадскага харчавання» ўзгадняць музычную праграму з... Міністэрствам культуры!

### Няспынны млын культуры

Як расказваюць людзі, якія ўсё ж прайшлі праз Дантавы колы рэгістрацый, усе пячаткі і візы ўстановаў належыць атрымліваць па чарзе, а не адначасова. Такім чынам, працэс рэгістрацыі займае ўвесь вольны час і можа расцягнуцца да… трох год! Увесь гэты час трэба плаціць арэнду за пустое памяшканне. Крэдыт на бізнес, які ніяк не развіваецца тры гады, браць бессэнсоўна. Такой крывёй атрыманы дазвол не хочацца парушаць — і таму ўласнік слухмяна фарбуе сцены сваёй кавярні не вышэй на 1,5 метра ад падлогі, ставіць столікі роўнымі шэрагамі, каб не замінаць эвакуацыі пры пажары. Бо ўжо не да творчасці.

У кожнай краіне існуе свой спіс юрпрацэдураў, неабходных для адкрыцця кавярні ці клубу. Але нідзе ён не з’яўляецца такім бессэнсоўным, як у Беларусі. Мой знаёмы ў ЗША марыць адчыніць з сябрамі джаз-клуб у Вашынгтоне. Для гэтай мэты ім неабходна атрымаць набор ліцэнзій: на гандаль півам, моцнымі напоямі, кухню і г.д. Але працэдура максімальна спрошчаная: хлопцы ведаюць, што збор дакументаў зойме роўна 45 дзён.

Марцін Котас — легендарны дзеяч нефармальнага руху ў Празе, дырэктар культавага клубу «Mlejn» — расказаў нам, што першы свой клуб ён адчыніў у 1994 годзе. Яго першым праектам стаў тэатральна-музычны цэнтр, які існуе дагэтуль, але з іншымі ўладальнікамі. На пытанне, якія цяжкасці існуюць з адкрыццём клубу ў Чэхіі, ён адказвае, што амаль ніякіх. Калі памяшканне, што арандуецца, ужо калісьці прайшло праверку ў пажарных і санстанцыі, новых ліцэнзіяў не трэба. Збор дакументаў займае максімальна два месяцы. Клубнай дзейнасці моцна замінае адно закон аб «начной цішыні» — а 10-й вечара ўсё павінна быць ціха, а выгоднае памяшканне для клубу далёка ад жылых будынкаў знайсці няпроста.

Супрацоўнік аднаго з нешматлікіх прывабных мінскіх бараў, які пажадаў застацца неназваным, падзяліўся праблемамі, з якімі ён пастаянна сутыкаецца. «Прыходзяць і пытаюцца: чаму столь зноў не пабялілі? Хто да вас хадзіць будзе? Белая столь, белыя сцены і сасіска ў цесце — гэта іх стандарт».

Культура піцця — частка культуры ўвогуле. Культура гарадскіх альтэрнатыўных клубаў — частка і агульнанацыянальнай, і шырэй глабальнай культуры. У Беларусі гэты млын пакрысе меле сваю муку, але памол яшчэ вельмі далёкі ад ідэалу. Калі вы нязгодныя, мы гатовыя дыскутаваць з вамі. Прыходзьце. Штопятніцы мы з сябрамі звычайна бухаем на Свіслачы. Другая лавачка справа ад мосціка Востраву Слёзаў.

▸ КНІГАРНЯ

# «ЗОРЫ НАД ЗАЛЬВЯНКАЙ» БЕЗ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

Сяргей ЧЫГРЫН

**У Слонімскай друкарні пабачыў свет паэтычны зборнік «Зоры над Зальвянкай», куды ўвайшлі вершы паэтаў краю. Такое выданне з'явілася ўпершыню, і яно прымеркавана да 750-годдзя Зэльвы.**




Я не хацеў пра гэты зборнік нідзе згадваць, але ж убачыў яго — і душа не вытрымала. Тым больш што меў да гэтай кніжкі непасрэднае дачыненне. А справа вось у чым.

Гэты зборнік складаў настаўнік з Дзярэчына Пятро Мікалаевіч Марціноўскі, які з 1977 года кіраваў зэльвенскім літаратурным аб'яднаннем «Зоры над Зальвянкай». У 2004 годзе ён цяжка захварэў і перадаў рукапіс кніжкі мне: «Сяргей, я дамовіўся з фундатарамі, таму даводзь кніжку да ладу і выдавай. Можаш дапоўніць яе вершамі новых маладых аўтараў». Я зрабіў усё, як казаў Пятро Мікалаевіч. У 2006 годзе яго не стала. Гэта была вялікая страта для ўсёй літаратурнай Зэльвеншчыны. Прайшло два гады пасля яго смерці, а кніжка так і не выйшла з друку. «Няма грошай», — сказалі фундатары. А Пятро Марціноўскі так хацеў патрымаць кніжку ў руках, парадаваць тых, каго ён чытаў, друкаваў на старонках зэльвенскай газеты «Праца», даваў дарогу ў літаратурнае жыццё, з кім шчыра сябраваў.

Пётр Марціноўскі ўсё жыццё пражыў у глыбінцы, але ніколі не старэў душою, не заставаўся ў баку ад падзей. Калі надараўся вольны час — ён ехаў у Мінск, Гародню, удзельнічаў у рэспубліканскіх і абласных літаратурна-мастацкіх мерапрыемствах. Быў дэлегатам першага, другога, трэцяга, чацвёртага з'ездаў Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, абіраўся сябрам Рэспубліканскай рады ТБМ. Літаратура і педагогіка ўсё жыццё крочылі з ім побач. Ды і сам пры жыцці выдаў дзве невялікія кніжачкі: «У нагу з часам» (1986) — пра педагагічны вопыт Дзярэчынскай сярэдняй школы і «Наша Лорка» (2002) — кнігу ўспамінаў пра Ларысу Геніюш, з якою сябраваў.

Справу Пятра Марціноўскага на Зэльвеншчыне вырашыла працягваць Яніна Шматко — адукаваная, шчырая жанчына, якая вельмі добра абазнаная ў літаратуры. У зэльвенскай раёнцы пачалі, як і пры Марціноўскім, рэгулярна выходзіць літаратурныя старонкі, рэпартажы з літаратурных сустрэч і вечароў, якія на Зэльвеншчыне арганізоўвае сама спадарыня Шматко. Неяк пры сустрэчы пагутарыў з ёю, каб яна звярнулася ў Зэльвенскі райвыканкам, а раптам яго супрацоўнікі дапамогуць выдаць гэты зборнік паэзіі, тым больш што ёсць нагода — юбілей Зэльвы. І ў Зэльвенскім райвыканкаме пагадзіліся. Я перадаў падрыхтаваны зборнік паэзіі Яніне Шматко, а тая — у райвыканкам.

Прайшоў пэўны час, і да мяне дайшлі чуткі, што паэтычны зборнік «Зоры над Зальвянкай» у Зэльвенскім райвыканкаме пасвойму «скарожылі», як пісала Ларыса Геніюш. Пасля гэтага я па тэлефоне дамовіўся аб сустрэчы з намеснікам старшыні Зэльвенскага райвыканкама Валянцінам Семянякам, які, дарэчы, сам піша добрыя вершы на роднай мове, і падборка якога таксама надрукавана ў гэтым зборніку, і паехаў у Зэльву. Падчас гутаркі Валянцін Міхайлавіч сказаў мне, што зборнік да юбілею Зэльвы з'явіцца ў друку, але без вершаў Ларысы Геніюш. «Валянцін Міхайлавіч, — кажу яму, — які можа быць зэльвенскі паэтычны зборнік без Ларысы Геніюш? Ды і Пятро Марціноўскі яго складаў. Гэта будзе непавага ў адносінах да вялікай беларускай паэткі і Пятра Мікалаевіча. Так рабіць нельга...»

Але зборнік вершаў выйшаў з друку без Ларысы Геніюш. Мала таго, нават з уступнага слова, якое да зборніка напісаў Пятро Марціноўскі, выкінулі радкі пра паэтку, і яна нідзе не згадваецца. Да гэтага зборніка я напісаў добрыя словы-згадкі і пра самога Пятра Мікалаевіча. Але і гэты артыкул не ўвайшоў у кнігу. Скарожылі...

## НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

### ДНІ ПОЛЬСКАГА КІНО

**З 26 па 30 лістапада ў сталічным кінатэатры «Цэнтральны» пройдуць Дні польскага кіно, арганізаваныя пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску. Пачатак усіх паказаў у 18.30.**

Як паведаміў каардынатар праектаў Польскага інстытута Ігар Блінкоў, мэта мерапрыемства — азнаёміць беларускага гледача з навінкамі польскага кінематографа. Паводле яго слоў, героі ўсіх фільмаў — маладыя людзі 20–30 гадоў, якім даводзіцца зрабіць нялёгкі маральны выбар.

26 лістапада дэманстраваліся анімацыйныя фільмы: «Сола на цаліне» рэжысёра Ежы Каліны, «Пакорлівая» (Пётр Думаля), «Велагонкі» (Марэк Серафінскі), «Настройка інструментаў» (Ежы Куця), «Ichthys» (Марэк Скрабецкі), «Каракас» (Анна Бляшчык), «Пеця і воўк» (Сюзі Тэмплетан).

27 лістапада — фільм Ежы Штура «Надвор'е на заўтра». Фільм удастоены Гран-пры міжнароднага кінафестывалю «Залаты рыцар» у Чэлябінску ў 2005 годзе і іншых узнагарод на нацыянальных кінафестывалях.

28 лістапада — фільм гэтага ж рэжысёра «Карагод». Фільм распавядае пра студэнта Бартэка, які прывык дзеля сваіх мэтаў маніпуляваць людзьмі. Нечаканае здарэнне прымушае яго зразумець, як важна чалавеку мець маральныя крытэры і ідэалы.

29 лістапада — паказ фільма Анджэя Севярына «Хто ніколі не жыў». Карціна — пра незвычайнага ксяндза Яна, які лёгка знаходзіць агульную мову з цяжкай моладдзю і наркаманамі. Нечакана Ян даведваецца, што ў яго СНІД.

30 лістапада гледачы ўбачаць фільм Лукаша Палкоўскага «Рэзервацыя». Фільм пачынаецца з пераезду фатографа Марціна Вілчыньскага ў даваенны дом. Па прапанове гаспадара фатограф здымае на фотакамеру дом і яго жыльцоў. Захапіўшыся фатаграфаваннем, Марцін адкрывае іншы свет, у які паступова апускаецца.

### МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС МАЛЮНКА

**З 18 лістапада па 12 снежня ў Мінску праходзіць II Міжнародны конкурс дзіцячага малюнка «Сябруюць дзеці на планеце». Арганізатарамі конкурсу выступаюць Міністэрства адукацыі Беларусі і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.**

Як паведамляе прэс-служба Мінадукацыі, у творчым спаборніцтве бяруць удзел канкурсанты з 12 краін: Кыргызстана, Арменіі, Азербайджана, Малдовы, Украіны, Туркменістана, Таджыкістана, Латвіі, Літвы, Беларусі, Расіі, Балгарыі. Усяго на конкурс было прыслана больш за 1500 дзіцячых работ.

Лепшыя з іх выстаўлены ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У экспазіцыю ўвайшлі 392 жывапісныя і графічныя работы дзяцей ад 5 да 16 гадоў. Тэматыка твораў разнастайная — гэта сям'я, захапленні, сябры, гісторыя, культура, традыцыі, прырода родных краін аўтараў малюнкаў.

Выстава арганізавана ў мэтах развіцця міжнароднага супрацоўніцтва і паразумення паміж юнымі талентамі розных краін, развіцця дзіцячай творчасці і пошуку новых талентаў, гаворыцца ў паведамленні прэс-службы.

### ПРЭЗЕНТАЦЫЯ МЕМУАРАЎ

**23 лістапада ў мінскім Чырвоным касцёле (касцёле святых Сымона і Алены) адбылася прэзентацыя мемуараў паэтэсы Дануты Бічэль «Хадзі на мой голас» — другой кнігі серыі «Гарадзенская бібліятэка», што выдаецца пад патранатам аднаго з лідэраў дэмакратычных сіл Беларусі Аляксандра Мілінкевіча.**

У 330-старонкавае выданне, ілюстраванае 32 фатаграфіямі з асабістага архіву паэткі, увайшлі эсэ пра Уладзіслава Чарняўскага, вядомых пісьменнікаў Васіля Быкава і Аляксея Карпюка, Ларысу Геніюш і Зоську Верас, Анатоля Сыса і Крысціну Лялько, Янку Купалу і Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча і Янку Брыля, Часлава Мілаша, Элізу Ажэшка і Наталлю Арсенневу.

Як зазначыла рэдактар рымска-каталіцкага штоквартальніка «Наша вера» К. Лялько, большасць эсэ, што ўвайшлі ў кнігу, раней былі апублікаваныя ў часопісе. Паводле яе слоў, мемуары, напісаныя з любоўю на мяжы паэзіі і прозы, уражваюць сваёй шчырасцю. Лялько лічыць, што кніга «застанецца ў гісторыі беларускай літаратуры як сведчанне часу і душы Дануты Бічэль, застануцца вобразы яе герояў, уся Заходняя Беларусь са сваімі рэаліямі, застануцца Біскупцы паэтэсы з яе сваякамі і суседзямі».

Доктар філалагічных навук Арсен Ліс назваў гэтую «незвычайную» кнігу зборам «жывых успамінаў пра перажытае, пра час, пра сябе і людзей, з якімі сустракалася паэтка, — чалавек з грамадзянскай пазіцыяй». Паводле яго слоў, «з талентам ад Бога», Данута Бічэль «глыбока, з болем і сумам кажа пра людзей і зямлю нашу, перажытае нашымі продкамі, пра беларускую гісторыю». Як зазначыў вучоны, кніга напоўнена хрысціянскай верай паэткі, якая, паводле яе слоў, імкнецца «ператварыць свой зямны час у любоў».

Першая кніга «Гарадзенскай бібліятэкі» — манаграфія доктара гістарычных навук Юрыя Гардзеева «Магдэбургская Гародня» — выйшла вясной гэтага года. У серыі рыхтуецца да выдання кніга Аляксея Карпюка «Развітанне з ілюзіямі» і зборнік невядомых старонак беларускага нацыянальнага руху «Небыцця не існуе».

**Паводле БелаПАН**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 28.11.2008. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.